Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

12 ЛІПЕНЯ 2023 г.
СЕРАДА
№ 132 (30012)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

НАРОДНЫ МАЙСТАР З АДЭЛЬСКА 4

СРОДКІ ГІГІЕНЫ ПОЛАСЦІ РОТА 6

КАРАТКА

- **Знешнегандлёвы абарот тавараў і паслуг Беларусі ў студзені — маі павялічыўся больш як на $5 млрд.**
- «Інтэграл» паставіць электронную кампанентную базу ў РФ на 1,5 млрд расійскіх рублёў.
- **ДПК: Літва аднавіла пропуск транспарту праз «Шальчынінкай».**

ЦЫТАТА ДНЯ

Юлія ЗУБАР, начальнік упраўлення прагназавання знешняга гандлю Міністэрства эканомікі:

«Экспарт тавараў расце двухзначнымі тэмпамі: 113,9 працэнта да ўзроўню студзеня — мая 2022 года. Найлепшая дынаміка ў спажывецкіх (128,3 працэнта) і інвестыцыйных тавараў (121,9 працэнта), што абумоўлена аднаўленнем інвестыцыйнай актыўнасці, а таксама попытам у Расійскай Федэрацыі. Цэнавыя аб'ёмы экспарту тавараў на расійскі і кітайскі рынкі максімальныя.Так, толькі за студзень — май пастаўкі ў Расію склалі $10,3 млрд, што супастаўна з гадавымі аб'ёмамі ў 2015 і 2016 гадах. Мы аднаўляем сваю долю ў расійскім імпарце. У гэтым годзе яна наблізілася да 9 %, што значна перавышае сярэдні ўзровень у апошнія 20 гадоў — 5-6 %. Продажы ў Кітай блізкія да $ 1 млрд — гэта больш, чым гадавыя аб'ёмы экспарту да 2022 года. Такая дынаміка сведчыць, што ёсць усе перадумовы для выхаду на мэтавыя $2,2 млрд да канца 2023 года».

ISSN 1990 — 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«НА ПРАЦЯГУ НАСТУПНАЙ ПЯЦІГОДКІ ЎВЕСЬ ДОЙНЫ СТАТАК ПАВІНЕН БЫЦЬ ТЭХНАЛАГІЧНА ПЕРАВЕДЗЕНЫ Ў КОМПЛЕКСЫ»

Наведваючы асобна ўзятае сельгаспрадпрыемства, Прэзідэнт паставіў задачы для ўсяго аграпрамысловага комплексу

Прэзідэнт Беларусі працягвае працаваць у рэгіёнах. Аўторак беларускі лідар правёў на Віцебшчыне. Кіраўнік дзяржавы наведаў малочнатаварны комплекс «Паўлінка», які ўваходзіць у склад ААТ «Агракамбінат «Юбілейны» ў Аршанскім раёне. Асноўнымі відамі дзейнасці прадпрыемства з'яўляюцца вырошчванне свіней і буйной рагатай жывёлы, вытворчасць і рэалізацыя малака, вытворчасць прадукцыі раслінаводства. У мінулым годзе падчас нарады аб рабоце аграпрамысловых аб'яднанняў Віцебскай вобласці ў Паставах кіраўнік дзяржавы падкрэсліваў, што стварэнне аграпрамысловых аб'яднанняў у Віцебскай вобласці — правільная стратэгія, але іх работа павінна прыносіць вынік. Гэтае пытанне кіраўнік дзяржавы трымае на кантролі. На пастаянным кантролі знаходзіцца і дзейнасць малочнатаварных комплексаў.

Фота Бел ТА.

Ці патрэбен для рэнтабельнасці палац?

Рабатызаваны малочнатаварны комплекс «Паўлінка» на дзве тысячы галоў буйной рагатай жывёлы ўведзены ў эксплуатацыю ў 2021 годзе. На 1 ліпеня 2023 года ў комплексе размяшчаецца 1830 кароў асноўнага статка. Цяпер комплекс загружаны на 91,5 працэнта. Выхад на праектную магутнасць плануецца да канца кастрычніка 2023 года. Раздача кармоў, даенне кароў — усё робіцца спецыялізаванымі робатамі. За 6 месяцаў 2023 года выраблена 6,8 тысячы тон малака, удой на адну карову складае 3833 кілаграмы. Малако рэалізоўваецца сортам «экстра».

Перш-наперш Прэзідэнт пацікавіўся ў дырэктара агракамбіната «Юбілейны» Аляксандра Фірсіна, як выконваюцца дадзеныя ім даручэнні, у прыватнасці арганізацыя машыннага двара, дзе ў мінулым годзе падчас адной з рабочых паездак пабываў Прэзідэнт. Аляксандр Фірсін далажыў, што ўсе дамоўленасці выкананы, на машынным двары зроблены рамонт. Цяпер там ёсць усё неабходнае для якаснага захоўвання, абслугоўвання і рамонту тэхнікі.

Вядома, «Паўлінка» не танны комплекс, на што звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка. Але, па яго словах, калі гаспадарка можа сабе гэта дазволіць, забараняць будаваць такія фермы ніхто не будзе.

СТАР. 2

Чалавек працы

ДОБРАЕ СЛОВА МЯНЯЕ НА МАЛАКО

Чаму «стаіць як карова» — найлепшая пахвала ад даяркі

Аператар машыннага даення ААТ «Птушкафабрыка «Рассвет» Святлана БЫКАВА прызнана «Чалавекам года» на Гомельшчыне ў намінацыі «Чалавек на зямлі». З году ў год працаўніца дасягае вельмі добрых вытворчых паказчыкаў. Была адзначана ганаровай граматай Камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні аблвыканкама. Па выніках работы прызнавалася найлепшай у прафесіі, яе імя заносілася на Дошку пашаны ў гаспадарцы. Усяго гэтага дастаткова, каб карэспандэнту «Звязды» захацелася пагутарыць са Святланай Быкавай асабіста. На свае вочы пабачыла, як аператар машыннага даення нясе службу на асаблівым участку малочнай вытворчасці.

СТАР. 4

Вандруй па Беларусі

ЗАГАДКАВАЯ ПУШЧА

Як адкрыць яе для сябе з дапамогай велапрагулкі?

У Белавежскую пушчу хочацца прыязджаць зноў і зноў. Бо ў кожнага, хто хоць аднойчы пабываў у лесе, поўным дзівосаў, ён застаецца ў памяці, свядомасці, уяўленні назаўсёды. У пушчу вяртаешся, каб дыхаць яе паветрам, слухаць яе зімовую гучную цішыню, вясновае шматгалоссе, летнюю звонкую раскошу. Адзін пажылы ляснік расказваў, што ад пушчы становішся залежным, яна паціху бярэ над табой уладу, калі доўга знаходзішся ў лесе і пачынаеш разумець яго мову. Ну а чалавеку, які трапіў упершыню і акунуўся ў гэтую гучную цішыню, тут становіцца ясна, што сапраўды важнае, а што не мае вялікага сэнсу.

СТАР. 12

«НА ПРАЦЯГУ НАСТУПНАЙ ПЯЦІГОДКІ ЎВЕСЬ ДОЙНЫ СТАТАК ПАВІНЕН БЫЦЬ ТЭХНАЛАГІЧНА ПЕРАВЕДЗЕНЫ Ў КОМПЛЕКСЫ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Аднак кіраўнік дзяржавы нагадаў пра сваё даручэнне вызначыць аптымальны па цане і якасці праект, які можна будзе выкарыстоўваць для будаўніцтва малочнатаварных комплексаў па ўсёй краіне. У якасці прыкладу Прэзідэнт прывёў гаспадарку «Радзіма» ў Бялыніцкім раёне і яе кіраўніка Аляксандра Лапацентава. «Выпяндрожу» не было, а гаспадарка рэнтабельная», — заўважыў ён. Прэзідэнт падкрэсліў, што комплексы павінны быць аптымальныя, а ў «Паўлінцы» — «палац дай бог».

Міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Ігар Брыло далажыў аб найбольш актуальных пытаннях развіцця сельскай гаспадаркі. Паводле яго слоў, у краіне расце вытворчасць малака, і дынаміка будзе павялічвацца. Ва ўсіх абласцях таксама нарошчваюцца аб'ёмы вытворчасці мяса. Але Прэзідэнт пачаў з надзённых пытанняў. Ён расказаў, што да яго паступаюць скаргі, што ў некаторых гаспадарках забараняюць прадаваць ялавых кароў, якія не дояцца па два-тры гады. «Нашто вы гэта робіце? Навошта вы там трымаеце, каб мець лічбу пагалоўя, ялавых кароў?» — спытаў Аляксандр Лукашэнка. Віцэ-прэм'ер Леанід Заяц запэўніў, што ў цэлым па краіне няма такой практыкі. Падобныя вынікі адзінкавыя і вырашаюцца на месцы.

«Добра, разбяромся. Не дай бог мы знойдзем хоць адзін такі выпадак. Гэта недапушчальна», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

абласцям даваць ордэны пакуль рана, паколькі ёсць яшчэ над чым працаваць. Але, па словах міністра, тэндэнцыя да памяншэння будзе ісці і далей.

Трэба будаваць аптымальныя комплексы па аптымальнай цане

Вялікую ўвагу ўдзялілі і непасрэдна галоўнай тэме дня — малочнатаварным комплексам. Міністр сельскай гаспадаркі і харчавання далажыў, што сёння 48 працэнтаў малочнатаварных комплексаў рабатызаваныя. Падчас даклада аб актуальных пытаннях сельскай гаспадаркі ў красавіку ў Гомельскай вобласці Ігар Брыло адзначаў, што ў краіне 281 малочнатаварны комплекс недаўкамплектаваны. З канца красавіка да пачатку ліпеня гэта лічба была скарочана да 94 комплексаў.

Аляксандр Лукашэнка спытаў пра падзеж жывёлы. «Непрадукцыйнае выбыццё за 6 месяцаў мы зменшылі на 21 тысячу — 76 працэнтаў. У гэтым непрадукцыйным выбыцці падзеж склаў 48 працэнтаў (мінус 3,4 працэнта да ўзроўню мінулага года). На 13 тысяч мы зменшылі забой у гаспадарках, які таксама быў падзяжом», — праінфармаваў Ігар Брыло.

«А на які працэнт ты арыентуеш па выбыцці?» — удакладніў Прэзідэнт. Паводле слоў міністра, даведзены паказчык па тэхналагічных стратах — 1,7 працэнта. Фактычны вынік — 1,4 працэнта. Гэта на 0,1 % менш за леташні ўзровень.

«Так, слухайце, вам трэба ордэны даваць», — заўважыў Прэзідэнт. Аднак Ігар Брыло адказаў, што Гомельскай і Магілёўскай

га комплексу. Я не кажу, што ён павінен быць танны або дарагі. Скупы плаціць двойчы, але лішніх грошай няма ў краіне. Мы павінны дакладна разумець, колькі каштуе аптымальны комплекс на дзве тысячы, тысячу дзвесце галоў», — канстатаваў ён. Прэзідэнт заўважыў, што не ўсюды трэба будаваць комплексы на дзве з паловай тысячы галоў. Трэба выходзіць з магчымасцяў кожнай гаспадаркі. «Я праціўнік канцэнтраваць столькі жывёлы ў адным месцы — мы загубім экалогію. Можа, недзе на 800, а недзе — і на 600 галоў», — адзначыў ён.

«Выснова адна: на працягу наступнай пяцігодкі ўвесь дойны статак павінен быць тэхналагічна пераведзены ў комплексы. Мы ўжо напрацавалі тэхналогіі. Мы не павінны падманваць самі сябе і іншых людзей, знаходзячыся ў цэнтры Еўропы, і даіць у малакаправоды ці яшчэ недзе ўручную», — падсумаваў кіраўнік дзяржавы.

«Збожжа заўсёды спатрэбіцца»

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што айчынны аграпрамысловы комплекс павінен пастаўляць на экспарт не сыравіну, не паўфабрыкат, а гатовую прадукцыю. Разгледзелі гэта на прыкладзе сухога малака, значны запас якога сёння захоўваецца на складах і рэалізоўваецца павольна. Але адказныя за аграпрамысловы комплекс запэўнілі, што гэтая тэндэнцыя не выклікае апасенняў і праблема ўжо вырашаецца.

Прэзідэнт расказаў, што ў Кітаі сухое малако спрасоўваюць, дадаюць туды мёд, ягады, розныя дабаўкі, і атрымліваюцца цукеркі, якія вельмі запатрабаваныя ў кітайскага насельніцтва. І самае галоўнае — гэта вельмі карысныя ласункі. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што Беларусь можа выпускаць такую ж прадукцыю, гэта нескладана, і сыравіны дастаткова. Такія прысмакі можна прадаваць як на ўнутраным, так і на знешнім рынках.

Аляксандр Лукашэнка таксама зацікавіўся падрыхтоўкай да ўборачнай кампаніі і перспектывай на сёлетні ўраджай. Паводле слоў міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Ігара Брыло, сёлета чакаецца нядрэнны ўраджай збожжавых і зернебабовых. Натуральна, з папраўкай на засуху. Прагназуецца збор дастатковых аб'ёмаў збожжа, пастаўкі ў лік дзяржзаказу будуць выкананы. Акрамя таго, засталіся запасы з мінулага года. Але для забеспячэння ўстойлівай работы жывёлагадоўлі неабходна дадаткова закупіць невялікія аб'ёмы збожжа ў Расіі. Набыць неабходна каля 0,5 мільёна тон.

Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што сёння на рынку складваецца нядрэнная для закупкі кан'юнктура цэн, таму трэба дзейнічаць у гэтым напрамку. «Пакуль таннае, трэба закупляць. І нават калі купленае збожжа будзе недзе блізка да сабекошту, так, калі магутнасці ёсць, трэба закупіць і пакласці. Гэта ж золатавалютны рэзерв. Збожжа заўсёды спатрэбіцца», — сказаў ён.

Прэзідэнту таксама далажылі аб уборцы амаль паловы пасеваў азімага ячменю. Гэта культура, нават у засуху, паказала нядрэнныя вынікі. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў правільнасць выбранай стратэгіі з вырошчваннем гэтай культуры.

Удзялілі ўвагу і апрацоўцы сланечніка. Раней Прэзідэнт асабіста азнаёміўся з сітуацыяй на палях з гэтай культурай. «Такі сланечнік я ва Украіне бачыў толькі ў дзяцінстве. Выдатна расце. У гэтую пару нам бы засіласаваць можна было, калі не хапае кармоў. Вышэйшы за мяне ростам. Трэба паглядзець, таму што пры такой засусе лес сланечніка стаіць», — расказаў ён.

Таксама кіраўніку дзяржавы далажылі пра стан пасеваў іншых сельгаскультур і планы на іх ураджай. Гаворка ішла пра рапс і лён. Прэзідэнт папярэдзіў, што ў рабоце з сельскагаспадарчымі культурамі, іх вырошчваннем і ўборкай не трэба бегчы «галопам па Еўропах».

Спыніце бюракратыю

Таксама падчас наведвання рабатызаванага малочнатаварнага комплексу Аляксандр Лукашэнка азнаёміўся з тэхналогіяй утрымання і даення буйной рагатай жывёлы. Дырэктар агракамбіната «Юбілейны» Аляксандр Фірсін расказаў Прэзідэнту аб планах па будаўніцтве новых комплексаў. І гэтыя планы можна рэалізаваць. Але, па словах дырэктара агракамбіната, сітуацыю ўскладняе вельмі доўгі працэс узгаднення праектнай дакументацыі. «Будаваць наогул немагчыма. Тры месяцы я раблю праект, а потым чатыры месяцы праходжу экспертызу», — адзначыў Аляксандр Фірсін.

«Рабі, як лічыш патрэбным. Я вам тысячу разоў гаварыў: спыніце гэту бюракратыю, — запатрабаваў Прэзідэнт ад віцэ-прэм'ера. — Гэтыя пытанні трэба зняць сёння. За цяганіну адкажаце», — канстатаваў Прэзідэнт.

«Па жыллі прынялі рашэнне: у вёсцы ці ў горадзе хоча чалавек прыватнае жыллё будаваць — ідзі і будуй, як ты лічыш патрэбным. Я і яму кажу зараз: ідзі і будуй, як лічыш патрэбным. А ён не гатовы псіхалагічна, кажа, што ад яго патрабуецца. Заўтра пачынай заліваць падмурак і будуй».

Прэзідэнту таксама прадставілі на дэгустацыю прадукцыю комплексу «Юбілейны» і прадпрыемстваў Аршанскага раёна.

Валерыя СЦЯЦКО, фота БелТА.

Аршанскі раён.

❍ У тэму

Што трэба для якаснага малака?

У размове з журналістамі дырэктар агракамбіната «Юбілейны» Аляксандр Фірсін расказаў, што ўнікальнасць іх малочнатаварнага комплексу ў робаце, аналагаў яму ў краіне няма. «Ды і ў свеце гэта перадавая тэхналогія. У адной шклянцы адбываецца ўвесь працэс падрыхтоўкі і даення, і можна піць малако, не абеззаражваючы яго», — адзначыў ён. Па словах Аляксандра Фірсіна, на надоі ўплываюць умовы, у якіх утрымліваецца жывёла. «Аб'ём паветра для каровы, прасторнасць, стойлы належныя, падыход да кармавога стала, добрыя кармы — гэта ўсё мае вялікае значэнне. Для таго, каб было вялікае і якаснае малако, карове трэба стварыць утульнасць, цеплыню, святло. І тады мы можам атрымаць вынік. Калі змясціць карову ў каровнік з нізкімі столямі, дзе душна, то ў нас не будзе выніку», — расказаў дырэктар агракамбіната.

Супрацоўніцтва

У КНР створаць беларуска-кітайскае прадпрыемства па вытворчасці малочнай прадукцыі

У Кітаі з візітам першы віцэ-прэм'ер Мікалай Снапкоў

Беларуска-кітайскае прадпрыемства па вытворчасці малочнай прадукцыі сёлета з'явіцца ў КНР. Такая дамоўленасць стала вынікам шэрагу афіцыйных перагавораў першага намесніка прэм'ер-міністра Беларусі Мікалая Снапкова ў рамках яго рабочага візіту ў Кітай з буйнымі кітайскімі інвестарамі і партнёрамі ў Пекіне, паведамілі ў прэс-службе ўрада.

Вынікам праведзеных сустрэч 9 ліпеня стала падпісанне шэрагу стратэгічных камерцыйных пагадненняў, у тым ліку аб стварэнні кітайскай кампаніяй Baimen сумесна з ААТ «Слуцкі сыраробны камбінат» у Шэньяне, што ў правінцыі Ляанін, сумеснага прадпрыемства па вытворчасці малочнай прадукцыі ўжо ў бягучым годзе. Кампанія Baimen — буйны экспарцёр беларускай малочнай прадукцыі (у мінулым годзе экспартавана прадукцыі на суму каля $50 млн). Рэалізоўваецца праект па перапрацоўцы малодзіва і атрымання сыраватачнага бялку на пляцоўцы індустрыяльнага парка «Вялікі камень».

«Беларускі бок вітае рашэнне кампаніі заняцца сумеснай вытворчасцю прадукцыі. Праект носіць стратэгічны характар і адпавядае ўстаноўленаму Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь Аляксандрам Лукашэнкам і Старшынёй КНР Сі Цзіньпінам 1 сакавіка бягучага года міждзяржаўнаму ўзроўню адносін усепагоднага і ўсебаковага партнёрства ў новую эпоху, — адзначыў першы намеснік прэм'ер-міністра. — Характар гэтых адносін павінен насіць прыкладны характар і даваць пэўныя вынікі».

Міністэрства прамысловасці Беларусі і China National Machinery Industry Corporation (Sinomach) падпісалі ў Кітаі план мерапрыемстваў па развіцці супрацоўніцтва, паведамілі ў прэс-службе Мінпрама. Подпісы пад дакументам паставілі намеснік міністра прамысловасці Беларусі Аляксандр Яфімаў і намеснік генеральнага дырэктара Sinomach Лі Сяаюй. Дакумент прадугледжвае рэалізацыю мерапрыемстваў па прыярытэтных напрамках супрацоўніцтва ў сферы вытворчасці сельскагаспадарчай, камунальнай тэхнікі, станкабудавання, а таксама рэалізацыі інвестыцыйных праектаў на беларускіх прадпрыемствах.

Рэалізацыя сумесных праектаў з Кітаем дасць магчымасць выйсці на стварэнне новых высокатэхналагічных вытворчасцяў. Аб гэтым заявіў старшыня Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Сяргей Шлычкоў, паведамілі ў прэс-службе камітэта. «Прапануем вывесці наша навукова-тэхнічнае ўзаемадзеянне на новы ўзровень і на сістэмнай аснове прапрацоўваць шляхі камерцыялізацыі сумесных праектаў. Для гэтага мы прапануем разгледзець магчымасці стварэння сумесных высокатэхналагічных вытворчасцяў па шэрагу кірункаў, якія ўяўляюць узаемную цікавасць. Такімі кірункамі, на нашу думку, могуць стаць робататэхніка, электратранспарт, медыцынскае абсталяванне і фармацэўтыка, лазерная тэхніка. Для арганізацыі сумесных вытворчасцяў мы можам выкарыстоўваць створаную намі інавацыйную інфраструктуру, у прыватнасці індустрыяльны парк «Вялікі камень», тэхнапарк у горадзе Чанчунь і іншыя пляцоўкі», — падкрэсліў Сяргей Шлычкоў. Вопыт стварэння сумесных прадпрыемстваў у Беларусі і Кітая ўжо ёсць. Так, у якасці прыкладу старшыня ДКНТ нагадаў аб стварэнні ЗАТ «Авіяцыйныя тэхналогіі і комплексы», якое паспяхова працуе на пляцоўцы «Вялікага каменя».

Першы намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Мікалай Снапкоў сустрэўся са старшынёй Дзяржаўнага агенцтва па міжнародным развіцці і супрацоўніцтве пры Дзяржсавеце Кітая Ло Чжаахуэем. Візіт Мікалая Снапкова арганізаваны ў мэтах рэалізацыі дамоўленасцяў лідараў Беларусі і Кітая, дасягнутых у ходзе дзяржаўнага візіту Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ў Кітай і ў рамках перагавораў са старшынёй КНР Сі Цзіньпінам.

Як адзначыў першы намеснік прэм'ер-міністра, краіны на працягу дзесяцігоддзяў пастаянна ўмацоўваюць партнёрства і з'яўляюцца сапраўды «жалезнымі братамі». Мікалай Снапкоў звярнуў увагу на стратэгічны характар работы па рэалізацыі праектаў у галіне развіцця і супрацоўніцтва. Беларусь заўсёды імгненна рэагуе на любыя ініцыятывы Кітая. Адной з першых краін падтрымала і стала ўдзельніцай ініцыятывы «Пояс і Шлях», а таксама ініцыятывы па глабальным развіцці.

Кіраўнік дзяржагенцтва таксама падкрэсліў, што беларуска-кітайскія адносіны выйшлі далёка за рамкі двухбаковага вымярэння, супрацоўніцтва мае глабальнае значэнне. Пералік сумесных праектаў у супрацоўніцтве па аказанні бязвыплатнай дапамогі ўрада Кітая вельмі шырокі. У Беларусі ўжо рэалізавана 15 важных сацыяльна арыентаваных праектаў на агульную суму каля 1,6 млрд кітайскіх юаняў. Бягучы партфель праектаў уключае знакавыя і важныя для народа Беларусі праекты, такія як будаўніцтва двух спартыўных аб'ектаў міжнароднага класа — стадыёна і басейна. У рабоце знаходзіцца каля дзясятка новых стратэгічных праектаў, у тым ліку па інфраструктурным развіцці індустрыяльнага парка «Вялікі камень», пастаўцы неабходнага тэхналагічнага абсталявання з агульнай сумай фінансавання ў памеры звыш 900 млн юаняў.

Бакі дамовіліся паскорыць рэалізацыю найважнейшых перспектыўных праектаў, забяспечыць фінансаванне і завяршэнне будаўніцтва спартыўных аб'ектаў да верасня 2024 года, планамерна развіваць сацыяльную, жыллёвую і вытворчую інфраструктуру індустрыяльнага парка «Вялікі камень», да канца года зацвердзіць шэраг праектаў і забяспечыць пастаўку важнага абсталявання ў мэтах рэалізацыі дамоўленасцяў лідараў Беларусі і Кітая і напаўнення новага статусу адносін — усепагоднага і ўсебаковага стратэгічнага партнёрства ў новую эпоху — новым зместам.

БЕЛАРУСКІЯ ПРАДПРЫЕМСТВЫ НА «ІНАПРАМЕ» ЗАКЛЮЧЫЛІ КАНТРАКТЫ НА $180 МЛН

Папярэднія вынікі работы беларускіх прадпрыемстваў на міжнародным прамысловым форуме «ІНАПРАМ-2023» склалі $180 млн. Аб гэтым заявіў старшыня Беларускай гандлёва-прамысловай палаты Міхаіл МЯТЛІКАЎ на палях міжнароднай прамысловай выстаўкі, паведаміла БелТА.

Некалькі стратэгічна важных дакументаў, накіраваных на ўзмацненне ўзаемадзеяння Беларусі і Расіі, падпісаны ў Екацярынбургу. Важнай часткай дзелавога форуму «Прамысловы дыялог: Расія — Беларусь», які быў арганізаваны міністэрствамі прамысловасці і сабраў прамыслоўцаў з абедзвюх краін, стала падпісанне чатырох важных дакументаў. Намеснік прэм'-ер-міністра Беларусі Пётр Пархомчык і намеснік старшыні ўрада Расіі — міністр прамысловасці і гандлю Дзяніс Мантураў падпісалі пагадненне паміж урадамі Беларусі і Расіі аб супрацоўніцтве ў галіне развіцця станкаінструментальнай прамысловасці.

Таксама на форуме былі падпісаны пагадненне паміж ААТ «БЕЛАЗ» — УКХ «БЕЛАЗ-ХОЛДЫНГ» і АТ «Расійскі экспартны цэнтр» аб узаемаразуменні і супрацоўніцтве, пагадненне паміж Беларускай гандлёва-прамысловай палатай і АТ «Расійскі экспартны цэнтр», а таксама комплексная міжведамасная праграма ў галіне авіябудавання. Як адзначыў Пётр Пархомчык, паміж Беларуссю і Расіяй даўно ўстаноўлены асаблівыя адносіны стратэгічнага партнёрства. Паводле яго слоў, пляцоўка «ІНАПРАМа» — яшчэ адна магчымасць падвесці вынікі, абмеркаваць актуальныя праблемы развіцця прамысловасці, знайсці новых партнёраў, падпісаць важныя кантракты і іншыя дакументы.

Дынаміка супрацоўніцтва паміж дзвюма дзяржавамі прадаўжае заставацца высокай, падкрэсліў ён. «Мы вельмі высока цэнім давер з боку Расійскай Федэрацыі. Больш цесна мы зблізіліся на працягу апошніх гадоў. Вы ведаеце, што Расійскай Федэрацыяй выдзелена крэдытная лінія на суму $1,5 млрд. Нашай краінай падрыхтавана на сёння 17 інвестыцыйных праектаў, якія ўзгоднены з урадам Расіі. Вельмі важна, што гэтыя інвестпраекты рэалізоўваюцца не толькі ў маштабах нашай дзяржавы, але і вырашаюць пытанні ўзаемнай прамкааперацыі, імпартазамяшчэння», — адзначыў намеснік прэм'ер-міністра. Ён заўважыў, што ў выніку гэтай работы тэхналогіі і прадпрыемствы, якія будуць створаны ў найбліжэйшыя 2-3 гады, якраз і вырашаць тыя праблемы, што ўзніклі цяпер з улікам пэўных дзеянняў недружалюбных краін.

Дзяніс Мантураў адзначыў, што з-за розных прычын больш свядома падыходзіць да разумення таго, што ў Саюзнай дзяржаве трэба выбудоўваць палітыку адзінага прамысловага складніка, пачалі з 2014 года. «Пачалася паступальная работа. Гэта заняло нейкі час, ішоў працэс прыціркі нашых вытворчых партнёраў ва ўсіх напрамках», — абазначыў ён. Гэтая праца прыносіць свае вынікі. Дзяніс Мантураў растлумачыў, што цяпер няма абмежаванняў і будзе развівацца супрацоўніцтва па ўсіх кірунках: ад традыцыйнага сельскагаспадарчага да новага — у галіне авіябудавання.

«Мы паспяхова супрацоўнічаем з Беларуссю ў сельгасмашынабудаванні, дадаўся таксама новы кірунак — авіяцыя. Мы знаходзім агульныя рашэнні па тых нішах, дзе было б узаемавыгадна ствараць новыя сумесныя авіяцыйныя прадукты. У прыватнасці, на парадку дня — вытворчасць 19-мясцовага самалёта. Гэта будзе добрым пачаткам для наступнага супрацоўніцтва. Таксама мы развіваем прамысловую кааперацыю ў галіне авіяцыйнай прамысловасці, у тым ліку пастаўкі кампанентаў для нашых бягучых праграм», — распавёў міністр прамысловасці і гандлю Расіі.

Яшчэ адзін важны кірунак супрацоўніцтва — электроннае машынабудаванне. «Без тэхналагічнага суверэнітэту ў электронным машынабудаванні мы заўсёды будзем залежаць ад паставак кампанентаў з-за мяжы, нават з дружалюбных краін, якія адгружаюць нам сёння тыя дэталі, якія мы не вырабляем ні ў Расіі, ні ў Беларусі. З улікам тых кампетэнцый, якія ў нас ёсць у гэтай галіне, упэўнены, мы забяспечым у найбліжэйшай перспектыве тэхналагічную незалежнасць і выйдзем на вытворчасць сумесных прадуктаў, кампанентаў, — падкрэсліў расійскі віцэ-прэм'ер. — Акрамя таго, мы не замыкаемся на ўнутраных задачах, а глядзім на асваенне рынкаў трэціх краін».

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Звыш 50 тысяч чалавек пацярпелі ў Лаосе ад касетных боепрыпасаў ЗША

Касетныя бомбы былі скінуты амерыканскай авіяцыяй у 1964—1973 гадах. Пасля прымянення касетных бомбаў звыш 30 тысяч чалавек загінулі і больш чым 20 тысяч атрымалі цяжкія раненні, многія страцілі канечнасці. Такія даныя прыводзяцца ў спецыяльным дакладзе ўпраўлення па размініраванні боепрыпасаў, якія не разарваліся, пры міністэрстве працы і сацыяльнай абароны Лаоса, паведаміла PIA «Навіны». Толькі трэць пацярпелых загінулі або атрымалі раненні падчас самой вайны. Дзве трэці падарваліся ўжо пасля яе на касетных боепрыпасах, якія засталіся ў зямлі і не разарваліся раней. З 18 правінцый Лаоса ў 15 засталіся такія боепрыпасы, узровень насычанасці імі дзевяці правінцый ацэньваецца як моцны. Усяго падчас вайны на Лаос упала 270 мільёнаў такіх бомбаў, каля 80 млн засталося ў зямлі і не разарвалася.

У большасці чэхаў значна знізіўся давер да ЕС, НАТА і ААН

Давер жыхароў Чэхіі да Еўрасаюза, НАТА і ААН значна знізіўся ў параўнанні з мінулым годам. Пра гэта сведчаць вынікі апытання насельніцтва краіны, апублікаваныя парталам навін irozhlas.cz, паведаміла ТАСС. Давер да ЕС апусціўся да найменшага з 2016 года ўзроўню. Гэтай арганізацыі цяпер давярае меншасць (46 працэнтаў) жыхароў Чэхіі. У мінулым годзе гэты паказчык складаў 58 працэнтаў. Да НАТА давер скараціўся з леташніх 67 да 56 працэнтаў, да ААН — з 63 да 52 працэнтаў. Падчас апытання, праведзенага рэспубліканскім Цэнтрам па вывучэнні грамадскай думкі, рэспандэнтам задаваліся таксама пытанні аб органах ЕС і іх кіраўніках. Высветлілася, у прыватнасці, што Еўракамісіі давяраюць усяго 38 працэнтаў рэспандэнтаў, а яе старшыні Уршулі фон дэр Ляен — 31. Кіраўніку еўрапейскай дыпламатыі Жазэпу Барэлю верыць менш за чвэрць (толькі 23 працэнты) апытаных, а кіраўніку Еўрасавета Шарлю Мішэлю — 24. Дзейнасць Еўрапарламента не выклікае пытанняў толькі ў 36 працэнтаў жыхароў Чэхіі.

У Паўднёвай Афрыцы ўпершыню за дзесяцігоддзе выпаў снег

Ліпень у Паўднёвым паўшар'і — зімовы месяц, але снег тут не выпадаў вось ужо 10 гадоў, адзначыла «Бі-бі-сі». «Многія вучні не ведалі, што такое снег, думалі, што гэта проста такі дождж», — распавяла настаўніца пачатковых класаў Агнес Мідэва. Улады параілі паўднёваафрыканцам апранацца цяплей, бо халодны фронт накрыў большую частку краіны і застанецца тут як мінімум на тыдзень. «Пакуль што снегапад не выклікаў сур'ёзных праблем», — паведаміў прадстаўнік Паўднёваафрыканскай метэаралагічнай службы. Снег выпаў у шэрагу правінцый Паўднёвай Афрыкі, уключаючы Усходні Кейп, Мпумалангу і рэгіён Гаўтэнг, у які ўваходзяць Ёханесбург і Саўэта. Метэаролагі параілі фермерам знайсці прыдатныя цёплыя памяшканні для жывёлы, асабліва важныя ў халоднае надвор'е.

ДОБРАЕ СЛОВА МЯНЯЕ НА МАЛАКО

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Пачынае працоўны дзень Святлана Канстанцінаўна звыкла для ўсіх, хто займаецца дойкай, — а палове на пятую раніцы. Працуе яна на малочнатаварнай ферме «Клімаўка».

— Заўсёды ўваходжу ў кароўнік і вітаюся: «Я прыйшла, мае прыгажуні!» Яны гэта вельмі добра разумеюць. Праходжу па зале і паўтараю: «Снедаем — і на працу, мае харошыя!» — смяецца даярка.

Побач са сваімі падапечнымі ўсе праблемы, трывогі, злосць ці смутак працаўніца навучылася выключаць, пакідаць за парогам кароўніка. Святлана Канстанцінаўна ўпэўнена, што ў яе спецыяльнасці вельмі важна не толькі добра даглядаць жывёл, але і быць крыху псіхолагам, педагогам, ветэрынарам і нават дрэсіроўшчыкам.

Амаль шэсць гадоў таму аператар машыннага даення перайшла на ўчастак, дзе займаецца раздойкай каровак, якія толькі пачынаюць даваць малако пасля першага цялення. Ад працы Святланы Канстанцінаўны залежыць, якія ў далейшым наогул будуць надоі ў гаспадарцы, што вельмі адказна.

— Я як выхавальнік у яслях, у групе адаптацыі, — пераходзіць на педагагічную лексіку і захапляльна распавядае пра сваю працу з жывёламі Святлана Быкава. — Мне даецца тры месяцы, каб прывучыць маладую кароўку «працаваць у калектыве», удзельнічаць у выбудаванай сістэме. Цяпер, напрыклад, у мяне 66 кароў, усе яны ўпершыню ацяліліся і вучацца як гэта — даваць малако.

Праз тры месяцы адаптацыі ў падапечных Святланы Канстанцінаўны выпуск. Яны пераходзяць у «агульную групу», так бы мовіць, — у асноўны дойны статак. За тыдні адаптацыі новага набору аператар машыннага даення імкнецца стварыць для самаадчування падапечных максімальна камфортныя ўмовы, у тым ліку калі прыходзіць падменная калега.

— Маладыя кароўкі ў такі адказны перыяд іх жыцця вельмі трывожацца, хвалююцца ў прысутнасці старонніх людзей. Таму я стараюся быць з імі як мага даўжэй, каб не дадаваць стрэсу з-за прысутнасці новага чалавека, — тлумачыць працаўніца.

Падчас здымкі аператар машыннага даення таксама просіць гучна не размаўляць і не бянтэжыць каровак. Высвятляецца, што за гады сваёй работы на гэтым участку прывучыла і сваіх калег: побач з яе падапечнымі ніякіх крыкаў, лаянкі. Яна падкрэслівае, што ў рабоце ні ў якім разе нельга біць жывёлу.

— Любы стрэс для жывёлы адцягвае працэс яе адаптацыі ў якасці карміцелькі. Дапамагаюць толькі ласка і добрае слова, — пераканана Святлана Канстанцінаўна.

Яе задача ў рабоце — не толькі непасрэдна дойка два разы на дзень і наладжванне гэтага працэсу, але і кармленне, і выгул жывёлы падчас ачыстку кароўніка. Дапамагае працаўніцы на змене слесар па наладцы машыннага абсталявання.

— Часам, калі ў першыя тыдні прывыкаюць кароўкі да раздойкі, даводзіцца затрымлівацца пасля змены, чакаю, пакуль усе супакояцца. Бо некаторыя трывожацца, а хтосьці з іх яшчэ і ўпарты, паказвае характар. Ёсць у мяне выдатніцы. Гэта тыя, хто прыходзіць у кароўнік і адразу разумее сістэму, што вось цябе клічуць есці, піць, потым клічуць даіцца, і не супраціўляюцца працэсу. Ёсць і такія, хто вельмі доўга паказвае нораў. Бо ёсць маладыя кароўкі, якія, нават нягледзячы на фізіялогію, што ўжо час прыйшоў, могуць не аддаваць малако, і працягвацца гэта можа не адзін дзень, — тлумачыць Святлана Канстанцінаўна.

Здараецца ў яе рабоце і рогапрыкладства. Таму, вядома, трэба быць вельмі акуратнай з маладымі падапечнымі.

— Мне дапамагае спакойны голас і тое, што ўмею загаварыць. Размаўляю са свавольніцай так, як бы супакойвала ўсхваляванага чалавека. Мае прыгажуні ўсё разумеюць. Вядома, у іх свае дзівацтвы, характары, — заўважае суразмоўніца.

З-за таго што каровы на яе ўчастку перыядычна мяняюцца, прыдумляць мянушкі ўсім працаўніца не бярэцца. Усе ў яе — Прыгажуні. Але ёсць такія жывёлы, якія вельмі адрозніваюцца ў групе — гэтых даярка вылучае асаблівай мянушкай.

— У мяне цяпер: Вавёрачка, Рожкі, Людка-Панда, Далмацінка. Наогул, усе кароўкі адрозніваюцца. Гэта толькі здаецца тым, хто не працуе з імі, што адрозніць жывёл у статку нельга, — заўважае Святлана Быкава.

Доіцца маладое папаўненне статка непасрэдна ў кароўніку, дзе ўтрымліваецца. Тут выдзелены даільны блок. У гэтым жа кароўніку адгароджана зона, дзе знаходзяцца каровы, якія восьвось прычакаюць з'яўлення цялят. Іх назірае ветурач. Пасля ўсіх неабходных мерапрыемстваў пасля цялення жывёла пераходзіць у асноўную секцыю маладых каровак. Падчас чысткі кароўніка першародак выводзяць на вуліцу ў асобны загон. Бо пакуль маладыя жывёлы ніяк не кантактуюць з асноўным дойным статкам. Пасля трох месяцаў, калі яны прывыкаюць да выбудаванай сістэмы дойкі, адчуюць працоўны рытм, падапечныя Святланы Канстанцінаўны ўжо будуць пераганяцца на дойку ў «дарослую» даільную залу.

— У мяне ёсць выдатніцы і тыя, хто даганяе. Прыйшла і «стаіць як карова». У нас гэта значыць, што цялушачка вельмі добра абвыкае да дойкі і паводзіць сябе спакойна.

Ёсць жывёлы, што да двух тыдняў будуць паказваць характар і не жадаюць увогуле падпарадкоўвацца распарадку жыцця ў гаспадарцы, — са свайго вопыту ведае працаўніца. На яе думку, у працэсе падрыхтоўкі каровы да яе будучай «службы» даярцы неабходна запасціся ласкай і цярпеннем, але быць заўсёды цвёрдай і паслядоўнай у працэсе прывучэння жывёлы.

— Святлана Канстанцінаўна — перадавік гаспадаркі. Неаднаразова яе імя занесена на Дошку гонару нашага прадпрыемства, яна адзначана граматамі ад кіраўніцтва. У яе добрыя паказчыкі ў рабоце, нягледзячы на вельмі цяжкі і адказны ўчастак. Чалавек і работнік яна вельмі годны. Таму кіраўніцтвам было прынята рашэнне вылучыць яе кандыдатуру на саісканне звання «Чалавек года». Мы ў гаспадарцы ганарымся нашай працаўніцай, — адзначыла **намеснік дырэктара па ідэалагічнай рабоце ААТ «Птушкафабрыка «Рассвет» Вікторыя ПРЫХОДЗЬКА.**

Як распавяла сама Святлана Быкава, больш за 20 гадоў таму прыйшла працаваць у сельскую гаспадарку выпадкова. У яе сям'і ніхто ніколі не меў справы з жывёлай. У малочнатаварную ферму ў Клімаўцы Святлана Канстанцінаўна ўладкавалася ў 2007 годзе. У яе працоўнай біяграфіі шмат дасягненняў, але званне «Чалавек года» мае асаблівы статус.

— З'явілася нагода для першага ў жыцці сапраўднага манікюру. Макіяж зрабіла і ўкладку і пасля ўручэння ўзнагароды прыйшла пры поўным парадзе на работу, — па-простаму выдае Святлана Быкава. — Калі назвалі прозвішча і выклікалі на сцэну да губернатара для ўручэння, я вельмі хвалявалася. За мяне прыйшлі балець і падтрымліваць трое маіх дзяцей і тры ўнучачкі.

Святлана Канстанцінаўна распавяла, што, калі яе дзеці былі маленькія, прыходзілі да яе на працу дапамагаць. Назаўжды ўрэзалася ў памяць, як дачка расказвала кароўкам казкі.

— Мая работа дала магчымасць вырасціць і вывучыць маіх дзяцей, паставіць іх на ногі. Старэйшы сын вывучыўся на чыгуначніка, дачка — медыцынская сястра, а малодшы сын заканчвае вучобу ў Беларускім дзяржаўным універсітэце транспарту. Дзеці і ўнукі ганарацца мной, — дзеліцца гераіня. — Мяне, дарэчы, у свой час у сельскую гаспадарку прывяла мара пра ўласнае жыллё. Дзеці маленькія былі, а свой дом пабудаваць не было ніякай магчымасці. Прыйшла працаваць, і мне выдзелілі вельмі добры домік з гародчыкам. Пазней жыллё прыватызавала.

Святлана Канстанцінаўна перакананa, што менавіта рашэнне прыйсці працаваць у гаспадарку змяніла ўсё яе жыццё. Аператар машыннага даення раіць усім, хто прыглядаецца да работы на зямлі, не думаць доўга, а дзейнічаць.

— Так, праца складаная, але патрабаванні ёсць усюды, на кожным прадпрыемстве. Усім маладым дзяўчатам, якія прыглядаюцца да маёй прафесіі, але, можа, баяцца, раю: не бойцеся, прыходзьце! Працаваць трэба ўсюды, у сельскай гаспадарцы ніхто не адпачывае. Затое ты заўсёды ведаеш, што за сваю добрую працу і добра заробіш, а яшчэ гасцьці дасягнеш у жыцці.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.

Спадчына

ЧАРАЎНІК ГУКАЎ

Народны майстар з Адэльска Мар'ян СКРАМБЛЕВІЧ узнагароджаны медалём Францыска Скарыны

Мар'ян Антонавіч на працягу 30 гадоў займаецца вырабам унікальных музычных інструментаў. Яго творчасць занесена ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Беларусі. Дзякуючы такім аматарам у гэты Спіс будзе ўключана і культура беларускай дуды на Гродзеншчыне.

Мар'ян Антонавіч больш за 80 гадоў жыве ў родным Адэльску — аграгарадку ў Гродзенскім раёне. У бацькоўскай хаце абсталяваў майстэрню, а ў цэнтры культуры стварыў музейны пакой, дзе захоўваецца звыш 300 музычных інструментаў.

І гэта не проста дудкі, а самабытныя інструменты. Іх у народнага майстра не пералічыць. Тут і флейты, і акарыны, і ражкі, і свістулькі, і жалейкі, і нейкія клякоткі-трашчоткі... Ёсць нават дудкі са шлангам, якія імітуюць гукі жывёл: вала, дзіка, зязюлі, жураўлёў. Усе інструменты — драўляныя. Майстар карыстаецца рознымі пародамі, іх каля сарака. Ёсць і экзатычныя. Напрыклад, бамбук з Інданезіі, кедр з Сібіры. Ці сасна, якой 300 гадоў, са смаляным пахам. Асабліва захапленне выклікаюць яго акарыны: калі традыцыйна гэты інструмент вырабляецца з гліны, то майстру ўдалося зрабіць адзіную ў Еўропе калекцыю драўляных акарын у выглядзе птушак і рыб.

Пра гісторыю кожнага інструмента Мар'ян Скрамблевіч расказвае з захапленнем. Усё, кажа народны майстар, зроблена з душой. Музыка, якая натхняе Мар'яна Антонавіча, суправаджае яго ўсё жыццё.

— І бацька, і дзядзька, і бабулін брат гралі на музычных інструментах, маці спявала ў касцёле. Там стаяў арган, але электрычнасці тады ў вёсцы не было, і мы, дзеці, хадзілі ў касцёл і ўручную качалі той арган, гэта было цяжка, пот ракой цёк па спіне, але музыка зачароўвала мяне, — успамінае народны майстар.

Мар'ян Антонавіч прыгадаў, што не ўсе ўхвалялі яго занятак. Маўляў, вырабляць дудачкі — гэта несур'ёзна. Але адмаўляцца ад свайго захаплення ён не стаў. Пастаянна ўдасканальваў майстэрства, шукаў новыя формы, новае гучанне.

— У мяне такі характар, што я проста не магу дазволіць сабе калі-небудзь паўтарыцца, калі стварaю новы інструмент, а таму на працягу ўсяго свайго жыцця шукаю новыя гукі, перарабляю старыя музычныя інструменты на свой лад, — расказвае музыкант.

У музеі знаходзіцца яго першая дудка, якая зроблена ў 1992 годзе. З цягам часу выраб музычных інструментаў стаў справай жыцця. Геаграфія іх прапіскі вельмі шырокая: Германія, Расія, Аўстрыя, Францыя і розныя куткі Беларусі. На яго інструментах іграюць як у аматарскіх музычных калектывах, так і ў прафесійных, іх выкарыстоўваюць Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, гродзенскі ансамбль музыкі і танца «Белыя росы».

— Мы вельмі ганарымся, што наш вядомы і любімы майстар Мар'ян Скрамблевіч узнагароджаны медалём Францыска Скарыны, — заўважыла **намеснік дырэктара Гродзенскага метадычнага цэнтра народнай творчасці Наталля РАМАНОВІЧ.** — Больш за тое, дзякуючы яго самабытнай творчасці, на нядаўнім пасяджэнні рэспубліканскага савета па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны была падтрымана прапанова аб наданні статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці Рэспублікі Беларусь элементу нематэрыяльнай спадчыны «Культура беларускай дуды на Гродзеншчыне». Адпаведная пастанова Міністэрства культуры будзе прынятая ў хуткім часе.

Як распавяла Наталля Раманоўна, дуда — традыцыйны музычны беларускі народны інструмент, які суправаджаў танцы, песні, прыпеўкі на сямейных і абрадавых святах, ігрышчах і кірмашах. Сёння дуда бытуе на тэрыторыі Польшчы, Чэхіі, Літвы, Паўночнай Украіны і Беларусі. На тэрыторыі нашай краіны дударская традыцыя развіваецца ў розных абласцях Беларусі. А вось гістарычным арэалам распаўсюджання культуры дуды з'яўляецца менавіта тэрыторыя Віцебскай, Мінскай і Гродзенскай абласцей, дзе сустракаліся аўтэнтычныя віды дударскай традыцыі з XVI—XVII стагоддзяў. У сярэдзіне XX стагоддзя назіраецца заняпад дударства на тэрыторыі Беларусі. На яго змену прыходзяць скрыпка і гармонік. Цікавасць да інструмента адраджаецца толькі ў канцы 80-х гадоў мінулага стагоддзя.

На Гродзеншчыне ў 90-х гадах адраджэннем беларускай дуды пачынае займацца Мар'ян Скрамблевіч, які шукае не новыя гукавыя якасці. А ў 2016 годзе «Творчасць майстра па вырабе музычных інструментаў Мар'яна Скрамблевіча аграгарадка Адэльск Гродзенскага раёна ўнесена ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Беларусі. Акрамя гэтага, Мар'ян Скрамблевіч з'яўляецца лаўрэатам дзяржаўнай прэміі дзеячаў культуры і мастацтва Беларусі.

Чараўнік гукаў, як называюць яго ў родным Адэльску, ахвотна дэманструе сваю калекцыю на розных святах і фестывалях, прымае бясконцыя экскурсіі, у тым ліку навучэнцаў музычных школ. Некалькі дзясятка дудак Мар'ян Антонавіч падарыў Гродзенскай музычнай школе. Ён лічыць, што кожны музыкант павінен валодаць народнымі інструментамі. Гэтыя гукі здольны закрануць душу кожнага.

— Я імкнуся пашырыць гукавы дыяпазон, удаскальваць яго, — кажа Мар'ян Антонавіч. — Адкуль бы чалавек ні прыехаў, душа аднолькавая, трэба яе разбудзіць, каб яна адгукнулася на дабро, на прыроду, каб чалавек не разбураў, а хацеў гэтую прыроду зберагчы.

Музыкай з нізкімі гукамі можна нават лячыць, упэўнены майстар. Калі дзіця плача, яно адразу заспакоіцца, калі такія гукі чуе, ужо не раз так адбывалася.

Адразу падумалася: а чаму б, напрыклад, не распаўсюджваць гэтую мелодыю праз электронныя носьбіты і выкарыстоўваць у пакоях псіхалагічнай разгрузкі? Бо гукі сапраўды незвычайныя. Напрыклад, унікальна гучыць парная жалейка, ёсць і трайныя дудкі. Мар'ян Скрамблевіч распрацаваў сваю аўтарскую сістэму стварэння духавых народных інструментаў і можа зладзіць іх у любой танальнасці.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

Прававая гасцёўня

ТАСТАМЕНТ, ДАВЕРАНАСЦЬ, ДАГАВОР ДАРЭННЯ

Як спадчынадаўцу распарадзіцца маёмасцю яшчэ пры жыцці

Падзел маёмасці, нажытай сужэнцамі сумесна ў шлюбе; афармленне завяшчання на чужога чалавека; дагавор дарэння і яго адмена; захаванне спадчыны, якую хочацца пакінуць толькі за сабою; шлюбны дагавор, у якім прапісаны ўмовы сумеснага жыцця і выхавання дзяцей... З такімі і падобнымі на іх пытаннямі людзі часцей за ўсё звяртаюцца да натарыусаў. Прычым многія стараюцца рабіць гэта не па запісе, а падчас бясплатных прававых кансультацый, якія Беларуская натарыяльная палата ладзіць цягам года, прымяркоўваючы іх да пэўных падзей. Адна з іх — «Прававы экспрэс» — была прысвечана Дню Незалежнасці. Мерапрыемства прайшло ў новым для натарыусаў фармаце: каманда юрыстаў ездзіла па Беларусі і праводзіла сустрэчы з усімі ахвотнымі на абласных чыгуначных вакзалах краіны, а таксама кансультавала падчас паездкі непасрэдна ў тэматычным купэ. На адной такой кансультацыі пабывала і карэспандэнт «Звязды», якая паслухала юрыдычныя турботы людзей.

Спадчына, якую трэба дабудаваць

— Пасля смерці брата адкрылася спадчына (дом, не завершаны будаўніцтвам), дабудаваць які ў мяне няма грошай. Мяркую, што ў гэтым могуць дапамагчы суседзі брата, якія даглядалі яго апошні час. І я хацела б аддзячыць ім, каб дом дастаўся ім. На маёмасць, якую я ўжо маю, я склала тастамент, аднак як быць, каб дом ад брата-спадчынніка не стаў спадчыннай маёмасцю пасля маёй смерці і не адышоў мужу, які п'е? Як я магу распарадзіцца гэтай маёмасцю пры жыцці?

Варвара М., г. Гомель.

На пытанне адказвае **Вольга БЛІНЦОВА, натарыус Мінскай гарадской натарыяльнай акругі:**

— Пакуль будаўніцтва дома не скончана, зрабіць з ім нічога нельга, бо яго фактычна не існуе, таму для пачатку трэба завяршыць узвядзенне будынка і зарэгістраваць яго. Калі суседзі здольныя дапамагчы ў дабудоўванні дома, можна аформіць на іх даверанасць, згодна з якой яны будуць заканчваць будаўніцтва. Паколькі працэс доўгі (а даверанасць дзейнічае тры гады), магчыма, спатрэбіцца яшчэ адна даверанасць, каб суседзі змаглі ў тым ліку і прадаць гэты дом яшчэ пры вашым жыцці і ад вашага імя. Тастамент, які вы склалі на маёмасць, што ўжо ў вас ёсць, заўжды можна адмяніць, змяніць ці перарабіць на ваш выбар. Дарэчы, калі маёмасць, якая ўказана ў тастаменце, будзе прададзена (або падорана) пры жыцці спадчынадаўца, то тастамент будзе невыканальны.

Права пераважнай пакупкі

— Парайце, як мне лепш распарадзіцца спадчынай, у якой ёсць сааладальнікі, прычым зрабіць гэта яшчэ пры маім жыцці. Я вагаюся паміж тым, каб скласці заявшчанне на сваякоў або прадаць маёмасць, бо надта блізкіх родных у мяне і няма.

Дзіяна Р., г. Мінск.

На пытанне адказвае **Марына ПЕРАПЛАЎЧАНКА, натарыус Гомельскай натарыяльнай акругі:**

— Тастамент можна скласці на любога чалавека. Калі ж чалавек збіраецца прадаць нерухомасць, атрыманую ў спадчыну, у якой ёсць саўладальнікі, то гэта трэба рабіць толькі па ўзаемнай іх згодзе. А згодна з правам пераважнай пакупкі, найперш прапанаваць купіць маёмасць менавіта ім як саўладальнікам. Перадача заявы аб намеры продажу нерухомасці абавязкова робіцца афіцыйна праз натарыуса. У дакументе акрэсліваецца, на якіх умовах (уся сума адразу наяўнымі, за безнаяўныя сродкі, шляхам растэрміноўкі, перавод сродкаў у кошт пагашэння нейкага крэдыту прадаўца), за колькі і што прадаецца. Дакументы накіроўваюцца саўладальнікам заказным пісьмом з паведамленнем. Такім чынам натарыус мае пацвярджэнне, што адрасат атрымаў заяву прадаўца. Калі праз месяц саўладальнік не купляе нерухомасць, то яе можна прапанаваць набыць любой асобе. Калі ж саўладальнік ухіляецца ад атрымання такога пісьма, то вырашаць пытанне прыйдзецца праз суд і даказваць, што сваімі паводзінамі саўладальнік парушае правы прадаўца на распараджэнне ўласнасцю. Здараецца, што суд прымае рашэнне не ўлічваць інтарэсы такога нядбайнага саўладальніка пры продажы маёмасці. Натарыус, дарэчы, можа і сам уручыць саўладальніку такую заяву, не адпраўляючы яе па пошце.

Вярнуць падоранае

— Некалькі гадоў таму я падарыла кватэру сваёй старэйшай дачцэ (яна інвалід), але стала падазраваць, што яе муж можа падгаварыць дачку прадаць гэтую нерухомасць. Я не хацела б, каб мой падарунак стаў звычайнымі грашыма, таму хачу адмяніць дагавор дарэння. Ці можна гэта зрабіць? І мне вельмі хацелася б, каб другая кватэра перайшла ў спадчыну маёй малодшай дачцэ (яна цяпер укладвае ў гэтую нерухомасць шмат сваіх сродкаў), і я не хачу, каб на яе прэтэндавалі мой муж-пенсіянер і першая дачка. Як гэта лепш зрабіць?

Галіна Пятроўна, г. Расоны.

На пытанне адказвае **Эліна ДАНІЛЕНКА, натарыус Брэсцкай натарыяльнай акругі:**

— Калі адораны згодны вярнуць нерухомасць, ён можа проста скласці такі ж дагавор дарэння і такім чынам вярнуць падарунак мірным шляхам без судовага разбору. Калі дамовіцца не ўдасца, то дарыльшчыку прыйдзецца звяртацца ў суд, дзе даказаць правамоцнасць сваіх поглядаў і думак адносна таго, чаму ён хоча вярнуць назад свой падарунак. Такі шлях даволі складаны, але ж ёсць выпадкі, калі рашэнне суда па адмене дагавора дарэння было станоўчым. Прымаліся да ўвагі такія акалічнасці, што адораны кепска ставіўся да дарыльшчыка, або хтосьці з бакоў нешта не так зразумеў падчас складання дакумента. Спатрэбяцца паказанні сведак, суседзяў, знаёмых.

Прасцей вярнуць падоранае, калі ў дагаворы значыцца артыкул 549 Грамадзянскага кодэкса, дзе акрэслена, што ў выпадку смерці адоранага раней дарыльшчыка дагавор можна адмяніць. Неабходна прад'явіць пасведчанне аб смерці, і дарыльшчык забярэ свой падарунак назад. Калі такі артыкул у дагаворы дарэння не ўказаны, то нерухомасць, падораная памерламу, аўтаматычна будзе дзяліцца паміж яго спадчыннікамі.

Інваліды і пенсіянеры — асобы, якія маюць права на абавязковую долю ў спадчыне, нават калі спадчыннік выказаў у тастаменце жаданне пазбавіць іх усяго. Так што сваю частку спадчыны яны ўсё роўна атрымаюць. Адзінае выйсце — скласці пры жыцці спадчынадаўцы дагавор дарэння абазначанай нерухомасці на малодшую дачку. Тады ні муж, ні сястра не змогуць прэтэндаваць на абавязковыя долі, як гэта было б у выпадку складання тастамента. Дагавор дарэння прадугледжвае пераход права ўласнасці на маёмасць ад дарыльшчыка да адоранага ў той жа час, як быў падпісаны дакумент. І дагавор дарэння амаль немагчыма аспрэчыць нікому, акрамя дарыльшчыка.

Ірына СІДАРОК, фота аўтара.

Шаноўныя чытачы, калі ў вас узніклі пытанні юрыдычнага характару, дасылайце іх на наш электронны адрас joya@tut.by. У «Прававой гасцёўні» разам са спецыялістамі мы будзем шукаць на іх адказы.

Бяспека

КАЛІ Ў ОФІСЕ БОЛЬШ ЗА +28 °С, ЧАС ПРАЦЫ ПАВІНЕН СКАРАЧАЦЦА

Вытрымліванне тэмпературнага рэжыму ў арганізацыях і на прадпрыемствах — задача работадаўцы і клопат тэхнічных інспектараў працы, якія павінны маніторыць умовы працы работнікаў, калі ўсталёўваецца гарачае надвор'е. Згодна з заканадаўствам, у цёплы перыяд года тэмпература ў офісах не павінна перавышаць +28 °С, а ў вытворчых памяшканнях (у залежнасці ад інтэнсіўнасці і віду работ) — ад +15 °С да +28 °С.

Тэхнічная інспекцыя працы Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі (ФПБ) на працягу усяго лета сочыць за вытрымліваннем тэмпературнага балансу і рэкамендуе ўносіць нормы, якія дазволяць бяспечна выконваць работы ва ўмовах павышаных ці паніжаных тэмператур, пры заключэнні (змяненні і дапаўненні) тарыфных пагадненняў і калектыўных дагавораў.

Асаблівая ўвага аддаецца прадпрыемствам, дзе дасягнуць аптымальнага мікраклімату немагчыма па тэхнічных і тэхналагічных прычынах. У такіх выпадках наймальнік абавязаны прымаць меры па дадатковай абароне работнікаў, расказаў **галоўны тэхнічны інспектар працы ФПБ Павел МАНЬКО:**

— Калі ў вытворчым памяшканні немагчыма падтрымліваць дапушчальныя параметры, кліматычныя ўмовы там павінны разглядацца як шкодныя і небяспечныя. Таму задача наймальніка — зрабіць максімум, каб на рабочых месцах было камфортна і бяспечна. Арганізаваць арганізаванне паветра, прымяняць сродкі індывідуальнай абароны з паветрапранікальных і гіграскапічных тканін, стварыць месцы для адпачынку, а таксама рэгламентаваць час работы ў такіх умовах. Іншымі словамі, калі ў офісе занадта горача, то час знаходжання на рабочым месцы павінны быць скарочаны.

Спецыяліст адзначыў, што апошнія гады тэхінспекцыя прафсаюзаў усё радзей сутыкаецца са скаргамі беларусаў на парушэнне тэмпературнага балансу на працы. Пераважная большасць наймальнікаў ведае, што трэба рабіць у перыяд павышаных тэмператур, і адказна падыходзіць да арганізацыі працоўных месцаў.

Тым не менш пытанні кантролю вытрымлівання тэмпературнага рэжыму застаюцца на кантролі інспектараў. А гарачая тэлефонная лінія ФПБ (+375 17 374 90 48), на якую ў будні з 8:30 да 10:30 і з 15:00 да 17:30 можна паведаміць пра парушэнні патрабаванняў аховы працы, працягвае працаваць.

Ірына СІДАРОК.

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

Скажыце, доктар...

Лета, спякота, атручванні

Як не падхапіць кішэчную інфекцыю?

Лета — не толькі пара доўгачаканых водпускаў і школьных канікулаў, але і час, калі ўзрастае рызыка кішэчных інфекцый. Пра тое, як засцерагчы сябе і сваіх дзяцей, расказаў урач-інфекцыяніст 11-й гарадской паліклінікі Мінска Андрэй МАКАРЭВІЧ.

— Андрэй Міхайлавіч, спачатку раскажыце, што разумеюць пад агульным паняццем вострых кішэчных інфекцый.

— Гэта група інфекцыйных захворванняў, якія суправаджаюцца парушэннем матарыкі страўнікава-кішачнага тракту з развіццём дыярэі, інтаксікацыі, а ў шэрагу выпадкаў — абязводжваннем.

Узбуджальнікамі вострых кішэчных інфекцый з'яўляецца шматлікая група бактэрый, вірусаў, прасцейшых і гельмінтаў, якія могуць выклікаць дысфункцыю кішэчніка. Найбольш часта ў клінічнай практыцы захворванне абумоўлена дызентэрыйнымі палачкамі (шыгелами), сальманеламі, патагеннымі кішэчнымі палачкамі (эшэрыхіямі), стафілакокамі, клебсіеламі, пратэем, іерсініямі, сінегнойнай палачкай, халернымі вібрыёнамі і інш. З вірусаў найбольшае значэнне маюць ротавірусы, энтэравірусы Коксакі, каранавірусы, адэнавірусы, вірусы Норвалк і інш. Дыярэя можа быць таксама абумоўлена амёбамі, лямбліямі, крыптаспарыдыямі. І гэты пералік узбуджальнікаў вострых кішэчных інфекцый далёка не поўны, многія з іх недастаткова вывучаны, пастаянна адкрываюцца ўсё новыя ўзбуджальнікі.

Узбуджальнікі вострых кішэчных інфекцый устойлівыя ў навакольным асяроддзі, могуць працяглы час захоўвацца на руках, посудзе, цацках і прадметах ужытку, у глебе і вадзе, інфікаваных фекаліямі хворага. Некаторыя з іх здольныя размнажацца ў прадуктах харчавання пры пакаёвай ці нават нізкай тэмпературы. Яны звычайна гінуць пры кіпячэнні і апрацоўцы дэзінфекцыйнымі сродкамі, якія ўтрымліваюць хлор.

— Хто начасцей схільны да захворванняў на кішэчныя інфекцыі?

— Захваральнасць на вострыя кішэчныя інфекцыі высокая і рэгіструецца на працягу ўсяго года з уздымам у летне-восеньскі перыяд. Хварэюць дарослыя і дзеці, прычым малыя найбольш часта ва ўзросце ад 1 да 7 гадоў.

Лятальнасць пры вострых кішэчных інфекцыях адносна невысокая і назіраецца пераважна ў дзяцей ранняга ўзросту.

— Як адбываецца заражэнне?

— Крыніца інфекцыі — хворы чалавек, а таксама носьбіты ўзбуджальнікаў захворвання. Найбольш небяспечныя хворыя на лёгкія, сцёртыя і бессімптомныя формы вострых кішэчных інфекцый. У дзіцячых калектывах крыніцамі эпідэмічных усплёскаў нярэдка бываюць работнікі харчаблокаў.

Асноўны механізм перадачы — фекальна-аральны, які рэалізоўваецца харчовым, водным і кантактна-бытавым шляхамі, радзей — паветрана-пылавым. Фактарамі перадачы з'яўляюцца ежа, вада, прадметы ўжытку, цацкі, інфіцыраваныя фекаліямі хворага, у перадачы некаторых інфекцый маюць значэнне насякомыя, у прыватнасці мухі. Заражэнню вострымі кішэчнымі інфекцыямі спрыяюць антысанітарныя ўмовы жыцця, незахаванне правіл асабістай гігіены, ужыванне заражаных прадуктаў харчавання, якія захоўваліся ці рыхтаваліся з парушэннем правілаў.

— Што рабіць пры сімптомах кішэчнай інфекцыі?

— Галоўным з'яўляецца аднаўленне аб'ёму страчанай вадкасці, якую можна папоўніць з дапамогай такіх прэпаратаў, як нормагідрон, які растварацца ў суадносінах 1 пакуначак на 1 літр вады, у суткі трэба выпіць мінімум 2 літры для дарослага чалавека. Сарбенты, напрыклад, такія, як усім вядомая смекта, таксама павінны выкарыстоўвацца ў такіх выпадках — 3 пакуначкі на суткі.

Сярод прэпаратаў, якія дзейнічаюць супраць узбуджальнікаў-бактэрый, добра паказаў сябе стопдыяр, які прымаецца ў адпаведнасці з інструкцыяй да прэпарата. Калі праблема вірусная характару, то можна рэкамендаваць прабіётыкі, напрыклад, такія, як прабіёлаг ці лінекс фортэ, таксама ў адпаведнасці з інструкцыяй. Нялішнімі будуць прэпараты крэон — гэта фермент, які дапаможа страваванню, і эспумізан, які ліквідуе газаўтварэнне. Пажадана ў перыяд хваробы захоўваць дыету. Варта адмовіцца ад малочных прадуктаў, а таксама ад гародніны і садавіны.

Карысна ведаць

ІНВЕСТЫЦЫІ ВА ЎСМЕШКУ

Як падабраць сродкі гігіены поласці рота

Усе ведаюць, што, каб захаваць зубы здаровымі, трэба правільна і якасна даглядаць поласць рота. Існуе мноства сродкаў гігіены, і ва ўсёй іх разнастайнасці лёгка заблытацца. Давайце разбяром, што павінна ўваходзіць у мінімальны гігіенічны набор дарослага чалавека.

Мануальная, электрычная ці гукавая?

Збяром даступны базавы набор для хатняй гігіены поласці рота, які складаецца з асноўных сродкаў гігіены: зубная шчотка, зубная нітка і зубная паста. І дадатковых: апалосквальнікі, пенкі, індыкатары налёту, ірыгатары і шматлікае іншае.

— Зубныя шчоткі бываюць мануальныя, электрычныя, гукавыя або ўльтрагукавыя. Аднак важна разумець, што не так важны тып шчоткі, як тэхніка чысткі зубоў. Здзяйсняючы правільныя рухі простай шчоткай, вы пачысціце зубы якасней, чым электрычнай пры няправільных рухах, — звярнуў увагу **стаматолаг-тэрапеўт 10-й гарадской стаматалагічнай паліклінікі Соф'я ГАНГАДЗЭ.**

Урач прапаноўвае ацэньваць зубныя шчоткі па наступных параметрах. Першае — гэта шчацінкі. Яны не павінны быць траўматычнымі для ачышчэння слізістай поласці рота і зубоў, а таксама пругкімі, гэта значыць, пры націсканні не павінны разыходзіцца ў розныя бакі. Другое — колькасць шчацінак: чым іх больш, тым большая плошча ачышчэння зуба. Трэцяе — працоўная частка або галоўка зубной шчоткі: выбірайце так, каб у вас была магчымасць дабрацца ў самыя цяжкадаступныя месцы. Ручка зубной шчоткі мусіць быць эрганамічная, каб яе зручна трымаць у руцэ і кіраваць ёй, каб рука не стамлялася на працягу трох хвілін.

Існуюць таксама монапучковыя зубныя шчоткі.

— Спатрэбяцца яны пацыентам, у якіх назіраецца цесната зубоў, а таксама для ачышчэння ў іншых цяжкадаступных месцах, напрыклад, зубоў мудрасці, бо велічыня працоўнай паверхні звычайнай зубной шчоткі не здольная так далёка дабрацца, — рэкамендуе ўрач.

Памятайце, што шчотку і насадку ад электрычнай шчоткі неабходна мяняць кожныя 2-3 месяцы, а таксама пасля правядзення прафгігіены і хірургічных аперацый.

На смак

Зубная паста — другі элемент, неабходны для гігіены. Паст існуе велізарная колькасць з розным саставам і смакам. Калі доктар не прызначыў вам спецыяльную лячэбную зубную пасту, то лепш зрабіць выбар на карысць комплекснай пасты з прыемным для вас смакам.

Пры выбары варта зважаць на паказчык абразіўнасці, утрыманне фтору і небяспечныя кампаненты ў саставе, а таксама варта разумець, якую праблему мы жадаем вырашыць.

Эфектыўнасць зубной пасты залежыць ад памеру абразіўных часціц у складзе, гэта значыць, ад паказчыка абразіўнасці. Важна разумець, што вялікія па памеры часціцы могуць траўміраваць эмаль (параўнаем іх са скрабам для цела: чым буйнейшыя часціцы скраба, тым больш траўматычна праходзіць працэс ачышчэння скуры). Для штодзённага догляду здаровых зубоў падыходзіць зубная паста з індэксам абразіўнасці 60—80 RDA.

Фтор у зубной пасце змяншае рост патагеннай мікрафлоры, развіццё карыесу на 25 % і спрыяе рэмінералізацыі зубоў. Гэта рэчыва ў зубной пасце знаходзіцца не ў чыстым выглядзе, а ў розных хімічных злучэннях. Не ўсе злучэнні фтору аднолькава эфектыўныя. Вось яны ў парадку паніжэння сваёй эфектыўнасці: (R)амінафтарыд (R) фтарыд натрыю (R)фтарыд волава (R)монафасфат натрыю.

Канцэнтрацыю фтору вымяраюць у ppm або ў працэнтах. Максімальна дапушчальнае працэнтнае ўтрыманне фтарыдаў у зубной пасце — 1500ppm (0,015 %). Для таго каб вызначыць, якое працэнтнае ўтрыманне фтору падыдзе менавіта вам, трэба пракансультавацца ў спецыяліста.

— Практычна любы кампанент зубной пасты можа выклікаць алергічную рэакцыю або непераноснасць, але самымі небяспечнымі кампанентамі ў складзе лічацца лаўрылсульфат натрыю і дыяксід тытану, а хлоргексідзін і трыклазан катэгарычна забараняецца выкарыстоўваць на пастаяннай аснове. Для якаснай гігіены поласці рота недастаткова проста мець добрыя сродкі гігіены, трэба яшчэ ўмела імі карыстацца, — падкрэслівае Соф'я Гангадзэ.

Круглая, плоская ці аб'ёмная?

Зубная нітка, ёршык або ірыгатар — тое, што дапамагае прачысціць міжзубныя прамежкі, тыя месцы, куды не пранікае зубная шчотка.

Зубная нітка чысціць дзве паверхні з пяці (гэта нямала!), таму не варта грэбаваць гэтым сродкам гігіены і неабходна выкарыстоўваць яе двойчы ў дзень, таксама як зубную шчотку і зубную пасту. Ёсць тры асноўныя катэгорыі зубных нітак — круглая, плоская і аб'ёмная. Круглая зубная нітка досыць тонкая і выдатна заходзіць у вузкія міжзубныя прамежкі, але чысціць меншую плошчу зуба, чым плоская або аб'ёмная.

Плоская зубная нітка такая ж тонкая, як круглая, але плошча ачышчэння зуба нашмат большая. Аб'ёмная зубная нітка пераўзыходзіць у дыяметры папярэднія два варыянты, а значыць, выдатна падыдзе для выкарыстання ў шырокіх і сярэдніх міжзубных прамежках. Калі ў роце ёсць дадатковыя канструкцыі, вам спатрэбіцца super-floss — спецыяльная нітка, якая мае прадаўжэнне на канцы і асноўную губчатую частку.

Навошта ёршыкі ды ірыгатары?

Дадатковыя сродкі гігіены прызначаюцца для людзей з дадатковымі канструкцыямі ў поласці рота, напрыклад брэкет-сістэмамі або артапедычнымі канструкцыямі (адзінкавыя каронкі, каронкі на імплантатах, мостападобныя канструкцыі). І нават вялікая колькасць пломбаў з'яўляецца дадатковымі канструкцыямі.

Ірыгатар — дадатковы прадмет гігіены, які не замяняе зубную шчотку і пасту. Пры яго выкарыстанні адбываецца масаж дзясен, што паляпшае кровазабеспячэнне і стымулюе ахоўныя сілы перыядонту. Адлегласць ад насадкі да зубоў павінна быць каля 2 міліметраў, а час выкарыстання — ад 1 да 10 хвілін. Ірыгатар вымывае харчовыя рэшткі, але не прыбірае з паверхні зуба мікробную біяплёнку, таму ў дадатак выкарыстоўваюцца дэнтальныя ёршыкі. Яны бываюць розных памераў і падбіраюцца персанальна стаматолагам, ён жа навучае, як іх правільна выкарыстоўваць. **Ёршыкі** чысцяць паверхні зубоў там, дзе зубная нітка не спраўляецца.

Скрабок дапамагае прыбраць налёт з языка. Зубы — гэта толькі 25 % ад усёй поласці рота. Астатнія 75 % — гэта язык і слізістыя абалонкі, якія таксама патрабуюць ачышчэння. Скрабок купляецца альбо асобна, альбо на адваротным баку шчоткі ёсць спецыяльныя гумовыя падушачкі. Асобна скрабкі бываюць пластыкавыя ці металічныя. Лепш аддаць перавагу пластыкавым, бо яны менш траўманебяспечныя. Змяняць пластыкавы скрабок трэба гэтак жа, як зубную шчотку, кожныя 3 месяцы, пасля правядзення прафгігіены і хірургічных аперацый. Чаму важна чысціць язык? Таму што на ім застаецца мяккі налёт, які можа быць прычынай непрыемнага паху з рота.

Апалосквальнік дапамагае прыбраць налёт са слізістай абалонкі, зніжае колькасць бактэрый у роце, забяспечвае свежае дыханне і прадухіляе ўтварэнне зубнога налёту, але некаторымі з іх нельга карыстацца кожны дзень, таму ўважліва чытайце інструкцыю і кансультуйцеся са стаматолагам. Выбіраць апалосквальнік варта гэтак жа, як зубную пасту: калі доктар не прызначыў вам лячэбны, выбірайце той, які прыемны на смак.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

12 ліпеня 2023 г. № 24 (710)

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

ЗАКАНАТВОРЧАСЦЬ

Змяненні, якіх чакаюць на месцах і ў цэлым у краіне

У чым сутнасць законапраектаў, разгледжаных сенатарамі на заключным пасяджэнні дзясятай сесіі Савета Рэспублікі сёмага склікання

Парламенцкі год члены Савета Рэспублікі завяршылі прыняццем амаль трох дзясяткаў законапраектаў. У цэлым, год для сенатараў быў няпросты. Згодна з абноўленай Канстытуцыяй, яны ўпершыню працавалі ў аднасесійным парадку. За мінулую сесію Саветам Рэспублікі, які з'яўляецца перадапошняй інстанцыяй перад прыняццем найважнейшых рашэнняў (у сілу закон або кодэкс уступае толькі пасля подпісу Прэзідэнта), парламентарыі разгледзелі і адобрылі праекты кодэкса і ста законапраектаў. 39 з іх датычацца выказвання згоды Беларусі на абавязковасць для яе міжнародных дагавораў.

Падчас дзясятай сесіі сенатары прынялі законапраекты, якія ўпершыню з'явіліся ў нашай краіне. Сярод іх — «Аб Усебеларускім народным сходзе» і «Аб народным апалчэнні». Вялікая работа была праведзена па прывядзенні законаў у адпаведнасць з абноўленай Канстытуцыяй: план выкананы больш як на 90 %. У гэтым, як падкрэсліла на закрыцці сесіі Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА, асаблівая гістарычная місія сёмага склікання — парламентарыі мелі дачыненне да выпрацоўкі шляхоў развіцця беларускай дзяржаўнасці.

Фота БелТА.

Новаўвядзенні, адобраныя сенатарамі падчас заключнага пасяджэння дзясятай сесіі, закрануць заканадаўства па пытаннях канстытуцыйнай судавытворчасці, судаводства і статусу суддзяў, Крымінальна-працэсуальны кодэкс, Кодэкс аб архітэктурнай, горадабудаўнічай і будаўнічай дзейнасці, а таксама Лясны кодэкс. Змяненні адбудуцца ў шэрагу законаў, звязаных з аховай навакольнага асяроддзя і экалагічнай жыццядзейнасцю, выдавецкай справай, прымусовым лячэннем і медыка-сацыяльнай рэадаптацыяй, дзяржаўным прагназаваннем, праграмамі сацыяльна-эканамічнага развіцця і іншым. Акрамя таго, члены Савета Рэспублікі ратыфікавалі пагадненні паміж Беларуссю і Расіяй аб стварэнні і функцыянаванні вучэбна-баявых цэнтраў сумеснай падрыхтоўкі ваеннаслужачых узброеных сіл абедзвюх краін, паміж Беларуссю і Зімбабвэ аб заахвочванні і ўзаемнай абароне інвестыцый, зацвердзілі справаздачы аб выкананні рэспубліканскага бюджэту і бюджэту дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва за 2022 год.

Абарона — справа народная

Пасля падпісання кіраўніком дзяржавы ў вызначаны заканадаўствам час уступіць у сілу адзін з найбольш рэзанансных законапраектаў, які ўпершыню папоўніў заканадаўчую скарбніцу краіны. Праект Закона «Аб народным апалчэнні» ў Савеце Рэспублікі прадставіў **начальнік Генеральнага штаба Узброеных Сіл — першы намеснік міністра абароны Віктар ГУЛЕВІЧ**. Ён адзначыў, што падрыхтоўка гэтага законапраекта ажыццяўлялася з мэтай стварэння прававых асноў добраахвотнага ўдзелу грамадзян у забеспячэнні ваеннага становішча ў складзе атрадаў народнага апалчэння. «Пры распрацоўцы праекта закона за аснову быў узяты сучасны вопыт стварэння добраахвотніцкіх фарміраванняў тэрытарыяльных абшчын Украіны ў 2022 годзе, — удакладніў начальнік Генштаба. — Падраздзяленні, якія разглядаюцца, ствараліся з ліку грамадзян, пераважна добраахвотнікаў (як правіла тых, якія не падлягаюць прызыву на ваенную службу па мабілізацыі), для вырашэння другасных задач у месцах, якія не прадугледжваюць дзеянні войскаў пад кіраўніцтвам органаў унутраных спраў або мясцовага кіравання. Такі ж падыход закладзены і ў распрацаваным законапраекце».

Фарміраванне народнага апалчэння будзе ажыццяўляцца на падставе ўказа Прэзідэнта Беларусі. Атрады народнага апалчэння могуць стварацца ў гарадах, пасёлках гарадскога тыпу і сельскіх Саветах адначасова з фарміраваннем у адміністрацыйным раёне тэрытарыяльных войскаў. Асноўнай задачай добраахвотнікаў, аб'яднаных у атрады народнага апалчэння, будзе з'яўляцца ў перыяд дзеяння ў краіне ваеннага становішча садзейнічанне органам унутраных спраў у абароне ўласнасці ад злачынных і супрацьпраўных замахаў на тэрыторыі, дзе яны жывуць. Таксама, па рашэнні мясцовых саветаў абароны, апошнія могуць прыцягвацца для вырашэння іншых задач па забеспячэнні ваеннага становішча. Падрыхтоўка атрадаў народнага апалчэння ў мірны час прадугледжана ў сістэме тэрытарыяльнай абароны пад кіраўніцтвам мясцовых органаў кіравання з прыцягненнем тэрытарыяльных органаў унутраных спраў і мясцовых органаў ваеннага кіравання.

Прыняцце Закона «Аб народным апалчэнні» дазволіць вырашыць дзве ключавыя задачы: даць магчымасць грамадзянам, якія па пэўных прычынах не падлягаюць мабілізацыі, са зброяй у руках добраахвотна ўдзельнічаць у абароне краіны, а таксама стварыць дадатковыя ўмовы па аказанні дапамогі праваахоўным органам у выкананні імі сваіх паўнамоцтваў пры забеспячэнні ваеннага становішча ў сельсаветах, сельскіх населеных пунктах, раёнах, асобных гарадах.

(Заканчэнне на 8–9-й стар.)

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

Адзіны дзень прыёму на Брэстчыне

19 ліпеня 2023 года члены Савета Рэспублікі правядуць адзіны дзень прыёму грамадзян у Брэсцкай вобласці

У гэты дзень парламентарыі наведаюць усе раёны рэгіёна, сустрэнуцца з жыхарамі, выслухаюць просьбы, прапановы і скаргі і па магчымасці акажуць садзейнічанне ў вырашэнні хвалюючых пытанняў.

Традыцыйна людзей чакаюць у выканкамах:

Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Іванаўна КАЧАНАВА — з 10.00 у **Ганцавіцкім** райвыканкаме (г. Ганцавічы, вул. Кастрычніцкая, д. 1; тэлефоны для запісу: 8-017-328-53-24, 8-017-328-58-11);

старшыня Пастаяннай камісіі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Сяргей Міхайлавіч СІВЕЦ — з 11.30 у **Лунінецкім** райвыканкаме (г. Лунінец, вул. Чырвоная, д. 1; тэлефоны для запісу: 8-017-222-36-34, 8-01647-2-13-08);

старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Ірына Анатольеўна СТАРАВОЙТАВА — з 11.00 у **Баранавіцкім** гарвыканкаме (г. Баранавічы, пл. Леніна, д. 2; тэлефоны для запісу: 8-017-327-26-71, 8-0163-65-26-40);

старшыня Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Міхаіл Іванавіч РУСЫ — з 10.00 у **Ляхавіцкім** райвыканкаме (г. Ляхавічы, пл. Леніна, д. 3; тэлефоны для запісу: 8-017-327-36-73, 8-016-332-15-74);

старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей Анатольевіч РАЧКОЎ — з 11.00 у **Іванаўскім** райвыканкаме (г. Іванава, пл. Кастрычніка, д. 2; тэлефон для запісу 8-01652-2-80-10);

член Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Юрый Іосіфавіч НАРКЕВІЧ — з 10.00 да 12.00 у **Камянецкім** (г. Камянец, вул. Брэсцкая, д. 9; тэлефон для запісу 8-01631-7-62-43) і з 13.00 да 15.00 у **Пружанскім** (г. Пружаны, вул. Р. Шырмы, д. 17; тэлефон для запісу 8-01632-2-21-58) райвыканкамах;

член Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Рыгор Васільевіч ПРАТАСАВІЦКІ — з 10.00 да 12.00 у **Пінскім** гарвыканкаме (г. Пінск, вул. Дняпроўскай Флатыліі, д. 21; тэлефон для запісу 8-0165-31-64-23) з 14.00 да 16.00 у Драгічынскім райвыканкаме (г. Драгічын, вул. Леніна, д. 138; тэлефон для запісу 8-01644-7-12-87);

член Пастаяннай камісіі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Ірына Юльянаўна САЧКОЎСКАЯ — з 12.00 у **Столінскім** райвыканкаме (г. Столін, вул. Савецкая, д. 69; тэлефоны для запісу: 8-01655-2-84-38, 8-029- 115-87-90);

член Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Уладзімір Фёдаравіч ХРАЛЕНКА — з 10.00 да 12.00 у **Бярозаўскім** (г. Бяроза, вул. Чырвонаармейская, д. 27; тэлефон для запісу 8-01643-3-46-00) і з 13.00 да 15.00 у **Івацэвіцкім** (г. Івацэвічы, вул. Леніна, д. 44; тэлефон для запісу 8-01645-9-24-43) райвыканкамах;

член Пастаяннай камісіі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Тамара Анатольеўна ШАТЛІКАВА — з 10.00 у **Маларыцкім** райвыканкаме (г. Маларыта, вул. Чырвонаармейская, д. 1; тэлефоны для запісу: 8-01651-2-00-51, 8-029-521-01-83);

член Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Анатоль Віталь евіч ШАЛТАНЮК — з 10.00 да 12.00 у **Жабінкаўскім** (г. Жабінка, вул. Кірава, д. 65; тэлефон для запісу 8-01641-3-50-64) і з 13.00 да 15.00 у **Кобрынскім** (г. Кобрын, пл. Леніна, д. 3; тэлефон для запісу 8-01642-3-50-74) райвыканкамах;

член Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Аляксандр Сяргеевіч КАРПІЦКІ правядзе прыём з 10.00 ва ўстанове аховы здароўя «Брэсцкая абласная клінічная бальніца» (г. Брэст, вул. Медыцынская, д. 7; тэлефон для запісу 8-0162-27-21 -01).

ПАПЯРЭДНІ ЗАПІС АЖЫЦЦЯЎЛЯЕЦЦА ПА ЎКАЗАНЫХ ТЭЛЕФОНАХ 13 і 14 ліпеня з 9.00 да 13.00 і з 14.00 да 16.00.

Змяненні, якіх чакаюць на месцах і ў цэлым у краіне

(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)

Як падкрэсліў **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей РАЧКОЎ**, законапраект падрыхтаваны з улікам сучасных рэалій і неабходны для ўмацавання нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь. Ён удакладніў, што праект Закона «Аб народным апалчэнні» некалькі разоў разглядаўся экспертным саветам пры Савеце Рэспублікі. Сярод экспертаў у тым ліку былі прадстаўнікі мясцовых органаў улады.

Пашырэнне паўнамоцтваў на месцах

Яшчэ адзін законапраект, які чакаюць на месцах, адобраны сенатарамі. Аб асноўных навацыях, якія закрануць заканадаўства па пытаннях мясцовага кіравання і самакіравання, расказаў **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Міхаіл РУСЫ.**

«Пашыраны правы мясцовых органаў улады, — звярнуў увагу сенатар. — У прыватнасці, дэпутаты будуць узгадняць прызначэнне кіраўнікоў сельгаспрадпрыемстваў і філіялаў, якія размешчаны на іх тэрыторыі, прымаць удзел у закрыцці або рэарганізацыі такіх установ, як, напрыклад, школа і дзіцячы садок. Дэпутаты будуць мець на грамадскіх пачатках двух памочнікаў з адзіным узорам пасведчання. Асобны артыкул вызначае механізм рэалізацыі грамадзянскіх ініцыятыў мясцовых органаў улады, якія будуць накіраваны на паляпшэнне жыццезабеспячэння населеных пунктаў. Напрыклад, гэта ўладкаванне дзіцячых, спартыўных пляцовак».

Акрамя таго, замацоўваецца парадак рэалізацыі дэпутатамі мясцовых Саветаў дэпутатаў паўнамоцтваў на ажыццяўленне міжнароднага супрацоўніцтва за межамі Беларусі. Прадугледжваецца стварэнне акруговага савета тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання ў Мінску і вызначаецца парадак яго дзейнасці. Выканкамы пярвічнага і базавага ўзроўняў надзяляюцца правамі на вызначэнне выканаўцаў для выканання работ на аб'ектах знешняга добраўпарадкавання, размешчаных на землях агульнага карыстання населеных пунктаў. Мясцовым адміністрацыям раёнаў у гарадах даецца права на зацвярджэнне рэжыму работы арганізацый (іх аб'ектаў), маёмасць якіх знаходзіцца ў камунальнай уласнасці, а таксама на ўзгадненне рэжыму работы іншых арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія ажыццяўляюць дзейнасць на адпаведнай тэрыторыі, у выпадках, прадугледжаных заканадаўчымі актамі.

Дзеля гістарычнай справядлівасці

Змяненні чакаюць і Крымінальна-працэсуальны кодэкс Рэспублікі Беларусь. Адпаведны законапраект падрыхтаваны Генеральнай пракуратурай у выкананне артыкула 3 Закона «Аб генацыдзе беларускага народа», згодна з якім Генеральнай пракуратуры даручана прыняць дадатковыя меры па ўсебаковым, поўным і аб'ектыўным даследаванні акалічнасцяў генацыду беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны і пасляваенны перыяд, устанаўленні асоб, якія маюць дачыненне да яго здзяйснення, і іх крымінальнаму пераследу. Новаўвядзенні накіраваны на забеспячэнне непазбежнасці адказнасці за ўчыненне злачынстваў супраць міру, бяспекі чалавецтва і ваенныя злачынствы, рэгламентуюць парадак вытворчасці па крымінальных справах аб названых злачынствах у адносінах да памерлых асоб незалежна ад згоды іх блізкіх сваякоў.

Як расказаў, прадстаўляючы законапраект у Савеце Рэспублікі, **генеральны пракурор Андрэй ШВЕД**, у ходзе расследавання крымінальнай справы аб генацыдзе беларускага народа Генеральнай пракуратурай устаноўліваюцца асобы, якія здзейснілі залачынствы супраць міру і бяспекі чалавецтва, якія з-за розных прычын не панеслі заслужанага пакарання. «Некаторыя з іх ужо памерлі, — заўважыў Андрэй Швед. — Згодна з дзеючым заканадаўствам, крымінальная справа не можа быць узбуджана, а па ўзбуджанай справаводства падлягае спыненню ў дачыненні да памерлага, за выключэннем выпадкаў, калі вытворчасць па крымінальных справах неабходная для яго рэабілітацыі. Крымінальна-працэсуальны закон не ўтрымлівае прававых механізмаў, якія дазваляюць расследаваць у поўным аб'ёме, а галоўнае, правесці судовы разгляд крымінальнай справы ў дачыненні да памерлага, калі яго сваякамі не пададзена ва ўстаноўленым парадку адпаведная заява».

Пры гэтым генеральны пракурор падкрэсліў, што злачынствы супраць міру, бяспекі чалавецтва і ваенныя злачынствы, уключаючы генацыд, не маюць тэрмінаў даўнасці. Па яго словах, з мэтай забеспячэння прынцыпу непазбежнасці адказнасці, зыходзячы з дзяржаўных і грамадскіх інтарэсаў, Генпракуратурай распрацаваны законапраект, які прадугледжвае магчымасць вытворчасці па крымінальных справах гэтай катэгорыі ў дачыненні да памерлых асоб незалежна ад згоды іх блізкіх сваякоў. Вытворчасць па крымінальнай справе будзе ажыццяўляцца па агульных правілах судаводства з улікам асаблівасцяў, звязаных з немагчымасцю ўдзелу абвінавачанага ў працэсе. Ніякіх спрошчаных працэдур па даказванні вінаватасці абвінавачанага праект не прадугледжвае.

Як рэзюмаваў **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Сяргей СІВЕЦ**, у Беларусі ідзе паслядоўная работа па захаванні і памнажэнні гістарычнай памяці, па супрацьдзеянні любым праявам фальсіфікацыі падзей і вынікаў Другой сусветнай вайны. «Важным этапам у гэтай рабоце стала прыняцце 5 студзеня 2022 года Закона «Аб генацыдзе беларускага народа», якім афіцыйна прызнаны і асуджаны генацыд беларускага народа ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны і пасляваенны час», — нагадаў парламентарый і дадаў, што прыняцце змяненняў у Крымінальна-працэсуальны кодэкс будзе садзейнічаць больш поўнай рэалізацыі прынцыпу непазбежнасці адказнасці.

Будаўніцтва — па новых правілах

Упершыню ў гісторыі нашай краіны разрознены масіў нарматыўных прававых актаў у галіне архітэктурнай, горада-будаўнічай і будаўнічай дзейнасці будзе сістэматызаваны ў адзіным комплексным дакументе — Кодэксе аб архітэктурнай, горадабудаўнічай і будаўнічай дзейнасці. Спрашчаюцца патрабаванні да архітэктурнай, горадабудаўнічай і будаўнічай дзейнасці. Прадугледжваецца магчымасць зацвярджэння перадпраектнай (перадінвестыцыйнай) дакументацыі ў скарочаным аб'ёме — у форме задання на распрацоўку праектнай дакументацыі: у выпадку прадухілення, ліквідацыі наступстваў будаўнічай аварыі, а таксама на капітальны рамонт, мадэрнізацыю, тэхнічную мадэрнізацыю, знос аб'ектаў першага—чацвёртага класаў складанасці і інш. Вызначаны выпадкі, калі распрацоўка перадпраектнай (перадінвестыцыйнай) дакументацыі не з'яўляецца абавязковай. Гэта будзе адносіцца да ўзвядзення, рамонту аднакватэрных жылых дамоў, нежылых капітальных пабудоў на выдзеленым зямельным участку, садовых домікаў, дач, гаражоў.

Акрамя таго, спрошчаны парадак узвядзення і рэканструкцыі аднакватэрных жылых дамоў і нежылых капітальных пабудоў пятага класа складанасці (на падставе пашпарта забудоўшчыка або дакумента, які сведчыць права на зямельны ўчастак), патрабаванні пры выкананні работ па бягучым рамонце. Уведзены паведамляльны прынцып у адносінах да вытворчасці будаўніча-мантажных работ замест раней дзеючага дазвольнага. Прадугледжана фарміраванне адзінага інфармацыйнага асяроддзя ў будаўнічай галіне, уключаючы вядзенне горадабудаўнічага кадастра, дзяржаўнай інфармацыйнай сістэмы «Дзяржбудпартал», рэспубліканскага фонду праектнай дакументацыі і рэспубліканскага банка даных аб'ектаў-аналагаў на будаўніцтва аб'ектаў.

«Удасканаленне нарматыўна-прававой базы ў будаўніцтве з'яўляецца важным фактарам у паляпшэнні інвестыцыйнага клімату ў краіне: у тэхналагічнай структуры інвестыцый звыш 50 % займаюць будаўніча-мантажныя работы, — адзначыла **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна РУНЕЦ**. — Ключавой ідэяй праекта кодэкса, работа над якім вялася з 2017 года, з'яўляецца спрашчэнне норм і правіл у будаўнічай сферы, аптымізацыя адміністрацыйных працэдур і залішняга ўмяшальніцтва дзяржаўных органаў у будаўнічую дзейнасць без шкоды для бяспекі аб'екта. Прыняцце законапраекта забяспечыць фарміраванне неабходных прававых паслуг для нарошчвання аб'ёмаў будаўніцтва, далейшага развіцця і павышэння эфектыўнасці будаўнічай галіны».

Дапамога залежным грамадзянам

Новаўвядзенні закрануць і заканадаўства па пытаннях прымусовага лячэння і медыка-сацыяльнай рэадаптацыі. Як расказаў **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей РАЧКОЎ**, праект закона распрацаваны з мэтай удасканалення заканадаўства аб прымусовым лячэнні і медыка-сацыяльнай рэадаптацыі грамадзян, хворых на хранічны алкагалізм, наркаманію або таксікаманію. «Дакументам прадугледжваецца карэкціроўка Закона «Аб парадку і ўмовах накіравання грамадзян у лячэбна-працоўныя прафілакторыі і ўмовах знаходжання ў іх» у частцы спрашчэння працэдуры накіравання грамадзян у лячэбна-працоўны прафілакторый з улікам правапрымяняльнай практыкі, а таксама на капітальны рамонт, мадэрнізацыю, тэхнічную мадэрнізацыю, знос аб'ектаў першага—чацвёртага класаў складанасці і інш. Вызначаны выпадкі, калі распрацоўка перадпраектнай (перадінвестыцыйнай) дакументацыі не з'яўляецца абавязковай. Гэта будзе адносіцца да ўзвядзення, рамонту аднакватэрных жылых дамоў, нежылых капітальных пабудоў на выдзеленым зямельным участку, садовых домікаў, дач, гаражоў.

Акрамя таго, спрошчаны парадак узвядзення і рэканструкцыі аднакватэрных жылых дамоў і нежылых капітальных пабудоў пятага класа складанасці (на падставе пашпарта забудоўшчыка або дакумента, які сведчыць права на зямельны ўчастак), патрабаванні пры выкананні работ па бягучым рамонце. Уведзены паведамляльны прынцып у адносінах да вытворчасці будаўніча-мантажных работ замест раней дзеючага дазвольнага. Прадугледжана фарміраванне адзінага інфармацыйнага асяроддзя ў будаўнічай галіне, уключаючы вядзенне горадабудаўнічага кадастра, дзяржаўнай інфармацыйнай сістэмы «Дзяржбудпартал», рэспубліканскага фонду праектнай дакументацыі і рэспубліканскага банка даных аб'ектаў-аналагаў на будаўніцтва аб'ектаў.

«Удасканаленне нарматыўна-прававой базы ў будаўніцтве з'яўляецца важным фактарам у паляпшэнні інвестыцыйнага клімату ў краіне: у тэхналагічнай структуры інвестыцый звыш 50 % займаюць будаўніча-мантажныя работы, — адзначыла **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна РУНЕЦ**. — Ключавой ідэяй праекта кодэкса, работа над якім вялася з 2017 года, з'яўляецца спрашчэнне норм і правіл у будаўнічай сферы, аптымізацыя адміністрацыйных працэдур і залішняга ўмяшальніцтва дзяржаўных органаў у будаўнічую дзейнасць без шкоды для бяспекі аб'екта. Прыняцце законапраекта забяспечыць фарміраванне неабходных прававых паслуг для нарошчвання аб'ёмаў будаўніцтва, далейшага развіцця і павышэння эфектыўнасці будаўнічай галіны».

Дапамога залежным грамадзянам

Новаўвядзенні закрануць і заканадаўства па пытаннях прымусовага лячэння і медыка-сацыяльнай рэадаптацыі. Як расказаў **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей РАЧКОЎ**, праект закона распрацаваны з мэтай удасканалення заканадаўства аб прымусовым лячэнні і медыка-сацыяльнай рэадаптацыі грамадзян, хворых на хранічны алкагалізм, наркаманію або таксікаманію. «Дакументам прадугледжваецца карэкціроўка Закона «Аб парадку і ўмовах накіравання грамадзян у лячэбна-працоўныя прафілакторыі і ўмовах знаходжання ў іх» у частцы спрашчэння працэдуры накіравання грамадзян у лячэбна-працоўны прафілакторый з улікам правапрымяняльнай практыкі, а таксама на капітальны рамонт, мадэрнізацыю, тэхнічную мадэрнізацыю, знос аб'ектаў першага—чацвёртага класаў складанасці і інш. Вызначаны выпадкі, калі распрацоўка перадпраектнай (перадінвестыцыйнай) дакументацыі не з'яўляецца абавязковай. Гэта будзе адносіцца да ўзвядзення, рамонту аднакватэрных жылых дамоў, нежылых капітальных пабудоў на выдзеленым зямельным участку, садовых домікаў, дач, гаражоў.

Акрамя таго, спрошчаны парадак узвядзення і рэканструкцыі аднакватэрных жылых дамоў і нежылых капітальных пабудоў пятага класа складанасці (на падставе пашпарта забудоўшчыка або дакумента, які сведчыць права на зямельны ўчастак), патрабаванні пры выкананні работ па бягучым рамонце. Уведзены паведамляльны прынцып у адносінах да вытворчасці будаўніча-мантажных работ замест раней дзеючага дазвольнага. Прадугледжана фарміраванне адзінага інфармацыйнага асяроддзя ў будаўнічай галіне, уключаючы вядзенне горадабудаўнічага кадастра, дзяржаўнай інфармацыйнай сістэмы «Дзяржбудпартал», рэспубліканскага фонду праектнай дакументацыі і рэспубліканскага банка даных аб'ектаў-аналагаў на будаўніцтва аб'ектаў.

«Удасканаленне нарматыўна-прававой базы ў будаўніцтве з'яўляецца важным фактарам у паляпшэнні інвестыцыйнага клімату ў краіне: у тэхналагічнай структуры інвестыцый звыш 50 % займаюць будаўніча-мантажныя работы, — адзначыла **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна РУНЕЦ**. — Ключавой ідэяй праекта кодэкса, работа над якім вялася з 2017 года, з'яўляецца спрашчэнне норм і правіл у будаўнічай сферы, аптымізацыя адміністрацыйных працэдур і залішняга ўмяшальніцтва дзяржаўных органаў у будаўнічую дзейнасць без шкоды для бяспекі аб'екта. Прыняцце законапраекта забяспечыць фарміраванне неабходных прававых паслуг для нарошчвання аб'ёмаў будаўніцтва, далейшага развіцця і павышэння эфектыўнасці будаўнічай галіны».

працэдура медыцынскага агляду грамадзян, неабходнага для вырашэння пытання аб накіраванні іх у ЛПП».

Прадстаўляючы сенатарам законапраект, **міністр унутраных спраў Іван КУБРАКОЎ** звярнуў увагу на тое, што асноўныя змяненні, якія ўносяцца законапраектам, датычацца ўстанаўлення максімальна зразумелага і практычнага парадку ізаляцыі ў ЛПП. «Дзеючы закон прадугледжвае тры варыянты накіравання ў ЛПП: агульны, а таксама два спецыяльныя — для працаздольных непрацоўных грамадзян, якія вядуць асацыяльны лад жыцця, і абавязаных асоб, — паведаміў кіраўнік міліцэйскага ведамства. — Аднак практычна 80 % грамадзян накіроўваюцца ў ЛПП на агульных падставах — гэта значыць, пры ўчыненні не менш як чатырох адміністрацыйных правапарушэнняў, з правядзеннем двух медыцынскіх аглядаў».

Цяпер прапануецца выносіць папярэджанне аб магчымасці накіравання ў ЛПП пасля здзяйснення двух правапарушэнняў у стане алкагольнага або наркатычнага ап'янення, а ў выпадку прыцягнення асобы да адміністрацыйнай адказнасці пасля аб'яўлення ёй папярэджання — праводзіць адзін медыцынскі агляд на прадмет устанаўлення наяўнасці або адсутнасці ў яго захворвання на хранічны алкагалізм, наркаманію або таксікаманію і наяўнасці або адсутнасці ў яго захворванняў, якія перашкаджаюць знаходжанню ў ЛПП. Па меркаванні Івана Кубракова, такія падыходы дазволяць пачынаць работу з правапарушальнікамі на больш ранняй стадыі, а таксама мінімізаваць затраты сіл і сродкаў органаў унутраных спраў і арганізацый аховы здароўя.

Акрамя таго, у законапраекце рэалізаваны парадак ізаляцыі ў ЛПП грамадзян, якія звярталіся або паступалі ў арганізацыі аховы здароўя ў сувязі з атручэннем наркотыкамі. «Прапануецца да аднаразовым факце аб'яўляць такім асобам папярэджанне аб магчымасці накіравання іх у ЛПП, — заўважыў міністр унутраных спраў. — Пры паўторным звароце або паступленні ў арганізацыю аховы здароўя з атручэннем будзе праводзіцца медыцынскі агляд такога грамадзяніна, матэрыялы — накіроўвацца ў суд. У законапраекце прапануецца выключыць этап прыняцця пастаянна дзейнымі камісіямі па каардынацыі работы па садзейнічанні занятасці насельніцтва рашэнняў аб неабходнасці ізаляцыі грамадзян у ЛПП, паколькі яны фактычна носяць дэкларатыўны характар».

Устанаўліваецца абавязак грамадзян выконваць патрабаванні супрацоўнікаў органаў унутраных спраў і службовых асоб арганізацый аховы здароўя пры правядзенні медыцынскага агляду. За невыкананне гэтых законных патрабаванняў асобы будуць прыцягвацца да адміністрацыйнай адказнасці. Гэта, па словах кіраўніка ведамства, дазволіць аказаць дзейснае ўздзеянне на тых, хто ўхіляецца ад абследавання.

Навацыі адукацыйнага характару

Прадметам прававога рэгулявання праекта Закона «Аб змяненні законаў» з'яўляюцца грамадскія адносіны па пытаннях прававога рэгулявання адносін у сферы адукацыі. «Для стварэння адзінага, цэласнага механізму прававога рэгулявання адукацыйных адносін уносяцца змяненні ў 16 законаў і два кодэксы, — удакладніла **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Ірына СТАРАВОЙТАВА**. — Законы карэкціруюцца

ПРАБЛЕМЫ І РАШЭННІ

СТАРШЫНЯ СЕЛЬВЫКАНКАМА — НЕ КАБІНЕТНЫ РАБОТНІК

Такія стэрэатыпы ў мінулым

Са старшынёй Дзешчанскага сельсавета Уздзенскага раёна Уладзімірам БАЛЦЯНКОВЫМ мы сустрэліся раніцай. Уладзімір Мікалаевіч спяшаўся ў райцэнтр са справаздачай. Я напрасілася паехаць з ім.

Па дарозе ва Узду мой суразмоўнік распавёў аб сваёй немалой гаспадарцы:

— На тэрыторыі сельсавета знаходзяцца 29 вёсак, 20 садовых таварыстваў. Сярод буйных населеных пунктаў — гэта пасёлак Дзешчанка, які лічыцца аграрадком. На працягу чатырох апошніх гадоў актыўнымі тэмпамі развіваецца населены пункт Валодзькі, дзе створаны раён індывідуальнай забудовы, які налічвае 220 зямельных участкаў. Цяпер у пасёлку пражывае каля 300—400 грамадзян, многа шматдзетных сем'яў.

На зваротным шляху заязджаем у Цеплень. Гэта буйны пасёлак, дагледжаны, акуратны, дзе перамяжоўваюцца шматпавярховыя і індывідуальныя дамы. Тут знаходзіцца такая вядомая кампанія, як «Беліта- Вітэкс». Спыняем на вуліцы мясцовага жыхара, пытаем, як жывецца.

— Не скардзімся, работы хапае, — адказвае Іван. — Працуюць вытворчыя і перапрацоўчыя цэхі, цэх па вытворчасці тары і ўпакоўкі, адкрыты цэх па вытворчасці касметыкі. Фермы адноўленыя ў Калодзіне, нават адмысловыя даільныя робаты ёсць. Пчалярства развіваецца, яблыневы сад у нас шыкоўны...

Вымерлых вёсак няма

— У нас няма выміраючых вёсак, нават такія маленькія, як Ладыга, Сянное, карыстаюцца папулярнасцю ў мінчан — прыгожая прырода, лясы. Мы тут пачалі фарміраваць зямельныя ўчасткі, прадаём на аўкцыёне, — кажа Уладзімір Балцянкоў. — Калі ў 2018-м прыйшоў на пасаду, пачаў маніторыць аварыйныя дамы, такіх было 15. Пачалі планамерна імі займацца, шукаць уладальнікаў. І сваякі хутка знайшліся, навялі парадак. Усяго ж знеслі тры дамы, сфарміравалі тры ўчасткі, адзін прадалі з аўкцыёну, тры аддалі тым, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў.

Мы аб'ехалі з Уладзімірам Мікалаевічам некалькі маленькіх вёсачак. Сапраўды, тут няма зарослых падворкаў, месцаў агульнага карыстання, усюды пакошана трава. У вёсцы Карпілаўка на лавачцы сядзяць жанчыны сталага веку, нешта абмяркоўваюць. «Вось выйшлі пасля работы ў агародзе крыху дух перавесці. Мікалаевіч часта нас наведвае. У яго такая манера — калі ў вёску праязджаць аўтакрама, ён прыязджае следам, пагутарыць з жыхарамі, пацікавіцца, чаго не хапае, як ідуць справы, — хваляць жанчыны старшыню.

— Уладзімір Мікалаевіч, у колькі гадзін пачынаецца ваш рабочы дзень? — пацікавілася ў свайго суразмоўніка.

— У шэсць-сем гадзін. Асабліва падчас сельскагаспадарчых кампаній сустракаюся з кіраўнікамі сельгасарганізацый, аб'язджаю тэрыторыю сельсавета, убачу звалку — тэлефаную ў ЖКГ, каб прыбралі, адсочваю працэс скошвання травы. У адналетняя вёскі магу адвезці касца, як толькі раса спадзе. А забраць у 11 гадзін, пакуль сонца не прыпякло. Людзей трэба берагчы. Я бываю ў кабінеце толькі ў сераду з 8 да 12 гадзін, калі вяду прыём грамадзян. Разам са спецыялістамі кантралюем вадаёмы, дзе забаронена купацца. Аб парушэннях устаноўленых правіл паведамляем участковаму.

Пад'язджаем да аднаго з азёр. На беразе ўстаноўлена таблічка, што купанне забаронена. Праўда, людзей тут не відаць. Рабочы дзень у разгары. Магчыма, вечарам хтосьці захоча апаласнуцца — гарантыі няма. Нягледзячы на папярэджанне, прафілактычную работу, знаходзяцца смельчакі рызыкнуць сваім жыццём. Пасля наведвання возера аб'язджаем мяжу паміж лесам і полем, дзе ўзарана супрацьпажарная паласа.

— Раней лічылася, што старшыня сельвыканкама — гэта кабінетны работнік, такія стэрэатыпы ў мінулым. У мяне малады прафесійны калектыў, які добра валодае тэхналогіямі і любую даведку можа выдаць наведвальнікам за 15 хвілін, хоць заканадаўства адводзіць на працэдуру пяць дзён, — задаволены Уладзімір Балцянкоў.

— З якімі пытаннямі звяртаюцца да вас жыхары?

— У Дзешчанцы галоўная праблема — вада. У нас уладкавалі станцыю абезжалезвання, якая ў ідэальнам стане, стаіць на цэнтральнай каналізацыі і абслугоўвае чатыры населеныя пункты. Але пасёлак, вескі развіваюцца, будуюцца, і магутнасцяў не хапае ў спякоту.

Якраз на ўездзе ў аграгарадок узвышаецца велічная воданапорная вежа, якая блішчыць у промнях сонца і бачна з усіх бакоў. Падымаецца пытанне аб усталяванні дадатковага аналагічнага збудавання.

Бізнес дынамічна развіваецца

У Дзешчанцы месціцца сялянска-фермерская гаспадарка «Алімп-Агра», якая спецыялізуецца на вырошчванні бульбы, морквы, буракоў, капусты. Прадукцыю пастаўляе на рынкі Беларусі, Расіі, дзяржаўным арганізацыям, ваенным часцям. «Алімп-Агра» актыўна развіваецца, у мінулым годзе ўзяла вялікую колькасць дадатковых зямель.

У вёсцы Ячанка знаходзіцца арганізацыя «Белінтэргент». Яшчэ гады чатыры таму пра яе мала ведалі. Кампанія ўзяла ў арэнду частку зямель, выкупіла дзве фермы, правяла іх рэканструкцыю, дынамічна, можна сказаць, сямімільнымі крокамі, развіваецца, мае племянны дойны статак. Ніводная гаспадарка не можа паспаборнічаць з ёй па надоях малака. Сапраўды, вакол фермы, у самім дварэ, на палях ідэальны парадак. Але, каб трапіць унутр памяшканняў, неабходна прайсці санітарную зону, ды і без дазволу кіраўніка ніхто не рызыкне туды пусціць старонніх.

— Дырэктар Віктар Зуеў сам наведваецца ў сельсавет, цікавіцца, у чым маем патрэбу, дапамагае вывезці смецце з могілак сваім транспартам, абкасіць тэрыторыі. Падчас свята вёскі школьнікам на 1 верасня за ўласныя сродкі кампанія закупляе падарункі.

Каля вёскі Валодзькі паставаў участак зямлі ў 50 сотак, шукалі інвестараў, некаторыя прыязджалі, глядзелі, адмаўляліся. Нарэшце знайшоўся чалавек, які адкрывае фірму і мае намер пабудаваць тут гандлёвы комплекс і дзіцячы забаўляльны цэнтр. Ён асабіста наведваўся ў школу, паглядзеў, што там шмат дзяцей, для якіх у вёсцы няма месцаў, дзе можна бавіць вольны час, кафэ.

Гістарычная памяць у пашане

У Цялякаве працуе фірма «Камфорт Плюс», займаецца шмат чым, але асноўны кірунак — пастаўкі беларускіх цяпліц за мяжу, якія разыходзяцца там на «ўра». Кіраўнік рэгулярна цікавіцца, чым можна дапамагчы сельсавету.

Уладзімір Мікалаевіч паказвае месца, дзе стаяў стары клуб, каля якога знаходзіўся помнік загінулым жыхарам гэтага населенага пункта і суседніх вёсак падчас Вялікай Айчыннай вайны. Клуб пераехаў, а помнік быў не ў самым лепшым стане. Дапамагла адрэстаўрыраваць, паставіць агароджу кампанія «Камфорт плюс». Цана пытання — 10 тысяч рублёў, у тым ліку дзве тысячы былі выдзелены з бюджэту сельсавета. У мінулым годзе 9 мая аб'ект адкрылі. У гэтай кампаніі свята шануюць гістарычную памяць, падтрымліваюць моладзь, на святы, Масленіцу набываюць прызы для ўдзельнікаў і пераможцаў конкурсаў.

У вёсцы Цеплень быў устаноўлены помнік лётчыку, якога збілі ў 1943 годзе. Зноў жа, «Камфорт Плюс» вырабіла з металу самалёт, пафарбавала, зрабіла стэлу.

Мы таксама наведалі мемарыял памяці бязвінна забітых фашыстамі мірных жыхароў у вёсцы Старына. Тут было ўсяго з дзясятак двароў. Вёска цалкам знішчана карнікамі разам з 47 яе мірнымі жыхарамі ў пачатку студзеня 1942 года. На жаль, больш не адрадзілася. У 2020 годзе ў знак памяці і смутку аб загінулых тут былі ўстаноўлены вялікі валун, званіца з прыгожым званом, высаджана алея дрэў, якія хутка падрастаюць.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

ў сувязі са змяненнем структуры вышэйшай адукацыі, узбуйненнем адзінак класіфікацыі адукацыі (выключаюцца паняцці «кірунак спецыяльнасцяў» і «спецыялізацыя»), перайменаваннем паслявузаўскай адукацыі ў навукова-арыентаваную, уключэннем у Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адукацыі паняцця «установы, якія рэалізоўваюць адукацыйныя праграмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі» і «спецыяльная школа-інтэрнат». У шэраг артыкулаў уносяцца змены для забеспячэння ўзгаднення іх з іншымі заканадаўчымі актамі, палажэннямі Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, Выбарчага кодэкса, Закона «Аб змяненні кодэксаў па пытаннях крымінальнай адказнасці» і іншымі. У законапраекце прадугледжаны нормы, якія накіраваны на ўдасканаленне механізмаў прававога рэгулявання з улікам практыкі іх прымянення».

У прыватнасці, у Законе «Аб пенсіённым забеспячэнні» ўдакладняецца кола асоб, што навучаюцца, якія маюць права на пенсію ў сувязі са стратай карміцеля. У Законе «Аб гарантыях па сацыяльнай абароне дзяцей-сірот, дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, а таксама асоб з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў» прадугледжаны гарантыі на атрыманне ў дзяржаўных установах адукацыі адораных дзяцей і моладзі. Законам «Аб статусе ваеннаслужачых» даецца магчымасць атрымліваць ваеннаслужачым, якія праходзяць ваенную службу па кантракце, з дазволу камандзіра (начальніка) дадатковую адукацыю дарослых (у вочнай форме атрымання адукацыі).

Удасканаленне банкаўскіх адносін

З некаторымі зменамі ў найбліжэйшы час будзе функцыянаваць і банкаўская сфера. Праект Закона «Аб змяненні законаў па пытаннях банкаўскай дзейнасці» прадугледжвае стварэнне эфектыўнага прававога механізму забеспячэння фінансавай стабільнасці ў Беларусі. Карэкціруецца парадак распрацоўкі і зацвярджэння асноўных кірункаў грашова-крэдытнай палітыкі. Павышаецца ўзровень прававой абароны спажыўцоў банкаўскіх паслуг, выключаецца празмерная фінансавая нагрузка на крэдытаатрымальнікаў. Прымаюцца меры, накіраваныя на пераход банкаў да прымянення Міжнародных стандартаў фінансавай справаздачнасці ў якасці першачарговых і адзіных стандартаў пры арганізацыі вядзення бухгалтарскага ўліку і фарміраванні бухгалтарскай (фінансавай) справаздачнасці. Павышаецца эфектыўнасць ажыццяўлення банкаўскага нагляду і кантролю за выкананнем заканадаўства аб прадухіленні легалізацыі даходаў, атрыманых злачынным шляхам, фінансавання тэрарыстычнай дзейнасці і фінансавання распаўсюджвання зброі масавага паражэння.

Як адзначыў **член Савета Рэспублікі Алег ЖЫНГЕЛЬ**, змяненні, якія ўносяцца ў законапраект, з'яўляюцца вельмі актуальнымі і своечасовымі. «Канкрэтна замацоўваюцца функцыі Нацыянальнага банка, камерцыйных банкаў, вызначаны іх мэты, правы, абавязкі, — удакладніў сенатар. — Усе заканадаўчыя акты ў банкаўскай сферы прыводзяцца ў адпаведнасць з Канстытуцыяй. Зменены падыходы па зацвярджэнні грашова-крэдытнай палітыкі банкаў. Акрамя таго, у законапраект увайшоў такі важны момант, як пераход банкаўскай сістэмы на стандарты міжнароднай банкаўскай справаздачнасці. Гэта вызваляе банкі ад двайной сістэмы складання справаздачнасці. Удзяляецца вялікая ўвага абароне правоў спажыўца. У прыватнасці пытанняў, якія датычацца крэдытавання насельніцтва. Часта банкі, калі крэдытуюць насельніцтва, вылучаюць штрафныя санкцыі, якія ў некалькі разоў перавышаюць першапачаткова ўстаноўленую стаўку па крэдытах, акрамя таго, налічваюць пеню за несвоечасовае пагашэнне працэнтаў, і атрымліваецца, што кліент, які звярнуўся ў банк і не змог у тэрмін разлічыцца па крэдыце, трапляе ў кабалу. Цяпер вызначаны канкрэтны тэрмін, калі банкі могуць прад'яўляць кліентам спагнанні».

Вераніка КАНЮТА.
Фота БелТА.

ДВАНАЦЦАЦЬ ВОДАРАЎ КАВЫ

І яшчэ шмат незвычайнага прапануюць гасцям энтузіясты адной вёскі

Прадукцыйным вопытам стварэння незвычайнага творчага савета і ініцыятыўнай групы сёння на Гомельшчыне можа падзяліцца Грабаўскі сельсавет Гомельскага раёна. Мазгавыя штурмы па пошуку ідэй для развіцця вёскі Грабаўка тут арганізоўваюць педагогі, вучні мясцовай школы і старшыня сельвыканкама. Ідэі і напрацоўкі неабыякавых вяскоўцаў ужо ляглі ў аснову міжнароднага турыстычнага праекта «Дарогамі Кацярыны». Ён аб'яднаў Гомельскі рэгіён і расійскую Браншчыну. І ўжо сёлета менавіта ў Грабаўцы плануецца правесці першы фестываль для гасцей з раёнаў, якія далучыліся да праекта, і не толькі.

Старшыня Грабаўскага сельвыканкама Наталля КІСЯЛЁВА, пераканана: этнаграфічны музей грабаўскай школы вылучаецца найбагацейшай экспазіцыяй і ўнікальнымі фотаздымкамі мясцовасці і тутэйшых жыхароў.

У Гомельскім раёне і рэгіёне ў цэлым гэты населены пункт амаль за 30 кіламетраў ад Гомеля вядомы сваёй багатай шматвяковай гісторыяй. Больш за стагоддзе Грабаўка належала роду Фашчаў. Менавіта пры іх вясковае наваколле перажыло вялікія перамены. Былі пабудаваны сядзібны дом, маслабойня, бровар і цукровы заводы, развівалася гарбарная вытворчасць, працавала некалькі млыноў. Па ініцыятыве Фашчаў у вёсцы была адкрыта школа, а ў 1818 годзе пабудавана каталіцкая капліца. Адметнасцю маёнтка стаў і закладзены сядзібны парк, папулярны ў асяроддзі памешчыкаў у канцы XVIII — сярэдзіне XIX стагоддзя. Побач з гэтай тэрыторыяй створана штучнае возера, для чаго пашырылі і паглыбілі рачулку Грабаўку.

— Да нашых дзён захавалася толькі малая частка сядзібнага парку, на тэрыторыі якога цяпер размяшчаецца школа. Захавалася і славутасць Грабаўкі — ліпавая алея. Яны ўключаны ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Беларусі. У склад гістарычнага комплексу ўваходзіць і возера, — распавяла жыхарка Грабаўкі, адна з самых вядомых мясцовых краязнаўцаў і захавальніца гісторыі роднага населенага пункта — **дырэктар Грабаўскай сярэдняй школы Таццяна МАЦЮШЭНКА.**

Мясцовыя жыхары штогод наводзяць парадак на тэрыторыі сядзібнага парку, высаджваюць новыя дрэвы, але імкнуцца захаваць аўтэнтычнасць гэтага месца, яго дух.

Так сталася, што цэнтрам сельскай актыўнасці ў Грабаўцы стала менавіта мясцовая навучальная ўстанова — сярэдняя школа. Менавіта тут, у коле школьнікаў і іх педагогаў, нараджаюцца ідэі развіцця вёскі. Ажыццяўляць задуманае бяруцца разам і пры падтрымцы сельвыканкама.

Найбагацейшая гісторыя Грабаўкі абавязкова павінна быць выкарыстана для развіцця айчыннай турыстычнай індустрыі, пераканаць мясцовыя жыхары. Грабаўскія настаўнікі і навучэнцы ўжо падрыхтавалі турыстычны маршрут па славутасцях вёскі. Добра зарэкамендавалі сябе і тэатралізаваныя пастаноўкі, праз якія мясцовыя школьнікі і педагогі знаёмяць з гісторыяй фамільнага роду былых уладальнікаў вёскі.

Праз тэатралізаваныя экскурсіі грабаўскія старшакласнікі знаёмяць з гісторыяй сваёй вёскі.

Зацікавіць турыстаў абавязкова і школьны этнаграфічны музей, найбагацейшая экспазіцыя якога ўражвае архіўнымі матэрыяламі, унікальнымі фатаграфіямі мясцовасці і тутэйшых жыхароў.

Яшчэ адна ўнікальнасць вёскі — адзіны ў сваім родзе ў Беларусі музей водараў з вялікай калекцыяй траў, адкрыты ў школе. Некалькі гадоў таму ён быў створаны сіламі калектыву навучальнай установы, вучняў і іх бацькоў. І гэты кірунак пастаянна развіваецца.

— Сёлета першы год мы з дзецьмі заклалі на тэрыторыі школы духмяныя градкі. Будзем вырошчваць і нарыхтоўваць сваю духмяную прадукцыю, — распавяла Таццяна Мацюшэнка. — Акрамя таго, з мінулай восені пачалі развіваць уласную школьную бізнес-кампанію. Вучні — удзельнікі гэтага аб'яднання па інтарэсах — вывучаюць асновы прадпрымальніцкай дзейнасці, складаюць тэхналагічныя карты сувенірнай прадукцыі, разлічваюць расходы на яе вытворчасць і прыбытак ад рэалізацыі.

Лячэбныя зборы і сувеніры, якія дзеці рыхтуюць з настаўнікамі, плануюць спецыяльна прэзентаваць з адсылкай да гістарычнага перыяду, звязаны з расійскай імператрыцай Кацярынай Вялікай. Гэта вельмі добрая магчымасць заявіць аб сваім населеным пункце і зацікавіць турыстаў, пераканаць жыхары Грабаўкі.

— Мы плануем на фестывалі арганізаваць дэгустацыю травяных чаёў і кавы з рознымі спецыямі, бо вядома, што сама расійская імператрыца была кававым гурманам. Акрамя таго, выкарыстоўвала ў якасці касметычных сродкаў і для падтрымання здароўя травяныя зборы. Мы гатовы падзяліцца нашым паспяховым вопытам, які ўжо апрабавалі. Гэта праект «12 месяцаў», дзе распрацаваны рэцэпты і поўнае інфармацыйнае суправаджэнне аб прыродных водарах для кожнага месяца ў годзе. Цяпер для фестывалю мы рыхтуем зноў падобны праект — 12 месяцаў з рознымі водарамі кавы, — раскрывае некаторыя дэталі дырэктар Грабаўскай сярэдняй школы.

Дырэктар Грабаўскай сярэдняй школы Таццяна МАЦЮШЭНКА і школьнікі-актывісты абмяркоўваюць новыя праекты.

Увогуле, сёння перад школьнікамі, іх педагогам і сельвыканкамам стаіць сур'ёзнае выпрабаванне — ажыццявіць усё задуманае.

— Перш чым заявіць пра сябе, жыхары вёскі доўгія гады працягвалі каласальную работу ў плане захавання і папулярызацыі гісторыі сваёй малой радзімы, таму абавязкова ўсё атрымаецца, — пераканана **старшыня Грабаўскага сельскага Савета дэпутатаў Наталля КІСЯЛЁВА.**

Кіраўнік сельвыканкама адзначыла, што асабліва ўражваюць падчас абмеркавання ідэі іх вясковай ініцыятыўнай групай актыўнасць і шчырая зацікаўленасць школьнікаў.

Так, на фестывалі мясцовыя педагогі і старшакласнікі плануюць цалкам сваімі сіламі праводзіць экскурсіі па роднай Грабаўцы: як традыцыйныя экскурсіі па вёсцы, так і ў фармаце тэатралізаваных імпрэз. Цяпер грабаўскія актывісты якраз шукаюць спонсараў, якія маглі б дапамагчы ім з пашывам касцюмаў, стылізаваных пад эпоху XVIII—XIX стагоддзяў.

— На фестываль мы плануем запрасіць не толькі жыхароў раёнаў — удзельнікаў праекта «Дарогамі Кацярыны», але і ўсіх ахвотных беларускіх рамеснікаў і майстроў, якія змогуць правесці майстар-класы і прадставіць таксама сваю прадукцыю, — падзялілася Наталля Кісялёва.

Мясцовыя жыхары Грабаўкі мараць, каб возера і парк сядзібнага гістарычнага комплексу захоўвалі і надалей свае аўтэнтычнасць і дух месца.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.
Фота аўтара і з архіва Таццяны МАЦЮШЭНКІ.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 11.865. **Нумар падпісаны ў 19.30 11 ліпеня 2023 года.**

Белгазпромбанк
Энергия твоего будущего!

Совместное белорусско-российское ОАО «Белгазпромбанк»
220121, г. Минск, ул. Притыцкого, 60/2. Телефон для справок: 120

Данная отчетность опубликована на сайте ОАО «Белгазпромбанк» www.belgazprombank.by

Форма 1

Бухгалтерский баланс 30 июня 2023 г.

ОАО «Белгазпромбанк»

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Сим-вол	Пункт приме-чаний	2023 год	2022 год
1	2	3	4	5	6
1	**АКТИВЫ**				
2	Денежные средства	1101		182 670	122 777
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102		371	305
4	Средства в Национальном банке	1103		198 792	533 479
5	Средства в банках	1104		319 911	367 706
6	Ценные бумаги	1105		846 964	880 071
7	Кредиты клиентам	1106		2 356 605	1 962 438
8	Производные финансовые активы	1107		-	-
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108		1 070	1 049
10	Основные средства и нематериальные активы	1109		240 320	246 344
11	Доходные вложения в материальные активы	1110		7 250	7 479
12	Имущество, предназначенное для продажи	1111		7 693	6 372
13	Отложенные налоговые активы	1112		-	-
14	Прочие активы	1113		50 184	32 250
15	**ИТОГО активы**	**11**		**4 211 830**	**4 160 270**
16	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**				
17	Средства Национального банка	1201		38	-
18	Средства банков	1202		414 215	834 827
19	Средства клиентов	1203		2 827 651	2 395 456
20	Ценные бумаги банка	1204		36 260	22 079
21	Производные финансовые обязательства	1205		-	-
22	Отложенные налоговые обязательства	1206		-	-
23	Прочие обязательства	1207		21 320	21 148
24	ВСЕГО обязательства	120		3 299 484	3 273 510
25	**СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ**				
26	Уставный фонд	1211		348 161	348 161
27	Эмиссионный доход	1212		-	-
28	Резервный фонд	1213		186 450	166 147
29	Фонды переоценки статей баланса	1214		105 157	69 998
30	Накопленная прибыль	1215		272 578	302 454
31	Всего собственный капитал	121		912 346	886 760
32	**ИТОГО обязательства и собственный капитал**	**12**		**4 211 830**	**4 160 270**

Форма 2

Отчет о прибылях и убытках за 1 полугодие 2023 г.

ОАО «Белгазпромбанк»

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Сим-вол	Пункт приме-чаний	2023 год	2022 год
1	2	3	4	5	6
1	Процентные доходы	2011		137 618	151 596
2	Процентные расходы	2012		58 709	71 710
3	*Чистые процентные доходы*	201		78 909	79 886
4	Комиссионные доходы	2021		74 271	61 626
5	Комиссионные расходы	2022		23 231	17 139
6	*Чистые комиссионные доходы*	202		51 040	44 487
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203		275	139
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204		1 985	(127)
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205		28 056	52 047
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206		-	-
11	Чистые отчисления в резервы	207		13 982	44 113
12	Прочие доходы	208		5 511	15 135
13	Операционные расходы	209		91 560	93 757
14	Прочие расходы	210		2 424	3 636
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211		57 810	50 061
16	Расход (доход) по налогу на прибыль	212		7 259	5 408
17	**ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)**	**2**		**50 551**	**44 653**

Председатель правления И.О. Потапова

Главный бухгалтер Н.А. Самусевич

Дата подписания: 4 июля 2023 г.

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 8 выдана Национальным банком Республики Беларусь 17.04.2023.
УНП 100429079

ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09; BELTORGI.BY

Продавец: **ОАО «Полеспечать»** (УНН 400062502), 246015, г. Гомель, ул. Лепешинского, 1, тел. +375291475023.

Первые публичные торги в электронной форме будут проведены: **15 августа 2023 г. 12.00. Место проведения торгов:** г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, оф. 28

Предмет торгов – имущественный комплекс:

Комплекс имущества ОАО «Полеспечать» в составе:

1.капитального строения с инвентарным номером 340/С-29090, общей площадью 1009,2 кв. м, наименование – производственный корпус, целевое назначение – здание административно-хозяйственное, –имеющего следующие составные части и принадлежности: два навеса, калитка металлическая с инв. № 170104, ворота металлические откатные с инв. № 170103, забор металлический с инв. № 170106; отопительные котлы каскадной системы с инв. № 170134 в количестве двух штук; лифт ЛМШ-150 с инв. № 170020, расположенное по адресу: Гомельская область, Речицкий район, г. Речица, ул. Урицкого, 19В;

2. капитального строения с инвентарным номером 340/С-29089, общей площадью 549,5 кв. м, наименование – складские помещения, целевое назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, – расположенное по адресу: Гомельская область, Речицкий район, г. Речица, ул. Урицкого, 19В/1;

3. капитального строения с инвентарным номером 340/С-3202498, наименование – электросети, назначение – сооружение специализированное энергетики, протяженностью – 40,8 м, – расположенное по адресу: Гомельская область, Речицкий район, г. Речица, кабельная линия от ТП № 2 до ЩЭУ административно-хозяйственного здания и до ВРУ здания склада по ул. Урицкого, 19В;

4. капитального строения с инвентарным номером 340/С-3202499, площадью 130 кв. м, наименование – асфальтовое покрытие, назначение – сооружение неустановленного назначения, – расположенное по адресу: Гомельская область, Речицкий район, г. Речица, асфальтовое покрытие возле административно-хозяйственного здания по ул. Урицкого, 19В.

Начальная цена предмета торгов – 650 000,00 бел. руб. с НДС. Телефон для ознакомления и осмотра +37529 698-53-53.

Для участия в торгах необходимо в срок с 13.07.2023 г. 09.00 по 14.08.2023 г. 16.00

1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «Сбер Банк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 календарных дней со дня проведения торгов возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, уплатить аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – не позднее 5 рабочих дней со дня проведения торгов.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: 8 (0212) 24-63-12, 8 (029) 510-07-63.

Продавец: открытое акционерное общество «ВИСТАН», 210627, г. Витебск, ул. Димитрова, 36/7, тел. 8 (0212) 608605.

Лот № 1. Кап. строение с инв. № 200/С-52094 площадью 3013,5 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Димитрова, 36/5, наименование – РМЦ, инструментальный цех, проходная, назначение – здание специализированное для производства машин и оборудования (машиностроения), составные части и принадлежности: подвал, две пристройки, – находящееся на зем. участке с кадастровым № 240100000002000413 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Димитрова, 36 (долевое право аренды).

Нач. цена: 485 400,00 бел. руб. с учетом НДС.

Задаток: 48 540,00 бел. руб.

Дата, время и место проведения повторного аукциона: 27.07.2023 в 12.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и приема документов: с 13.07.2023 с 08.30 по 26.07.2023 до 17.30. Заявления на участие в аукционах со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Задаток перечисляется на р/с ККУП «Витебский областной центр маркетинга» № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК МТВКВУ22, УНП 390477566, код операции 40901. Ранее опубликованное извещение: газета «Звязда» 31.05.2023. **Условия повторного аукциона:** победитель аукциона (единственный участник аукциона) обязан: в течение 10 (десяти) раб. дней с даты проведения аукциона возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для проведения аукциона, и расходы Продавца на проведение независимой оценки; заключить договор купли-продажи предмета аукциона в течение 15 рабочих дней с даты проведения аукциона, оплатить предмет аукциона в течение 30 календарных дней с даты заключения договора купли-продажи. Расходы Продавца на проведение независимой оценки по лоту № 1 – 422,64 бел. руб. с НДС. **Повторный аукцион проводится в порядке, установленном Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609.** Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивид. предпринимателем РБ – копия документа, подтверждающего гос. регистрацию юр. лица или индивид. предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на бел. или русск. язык; представителем юр. лица РБ – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивид.предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на бел. или русск. язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, руководитель юр. лица – также документ, подтверждающий его полномочия. Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты проведения аукциона отказаться от проведения аукциона. Доп. информацию можно получить по тел.: (0212) 24-63-12, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by. Ознакомиться с предметом торгов можно по предварительному согласованию с Продавцом по тел.: +375 (33) 614 34 61, +375 (212) 60-85-95 Пищик Александр Александрович.

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

Извещение о проведении повторных электронных торгов

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. УНП 191021390
Продавец	ОАО «Управляющая компания холдинга «Бобруйскагромаш», Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Шинная, 5. УНП 700067572
Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638 – www.ipmtorgi.by

Предмет электронных торгов

Лот № 1

Помещение столовой (710/D-68145, 2205,2 кв. м, составные части: мощение). Адрес: **Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Шинная, 3-3**

Начальная цена лота №1 с НДС 20 % – 324 000,00 бел. руб.
(снижена на 50 %)

Лот № 2

Столовая (здание нежилое, инв. № 712/С-8788, **128 кв. м**). Адрес: **Могилевская обл., Кировский р-н, Боровицкий с/с, аг. Боровица, ул. Центральная, 5А.**
Сведения о земельном участке: пл. **0,0723га,** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для строительства и обслуживания здания столовой. Ограничения (обременения) прав: зона санитарной охраны источников питьевого водоснабжения централизованных систем питьевого водоснабжения (пл. 0,0554 га)

Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 9149,35 бел. руб.
(снижена на 80 %)

Лот № 3
Адрес: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Шинная, д. 13

Здание инженерного корпуса (инв. № 710/С-2146, 4561,3 кв. м, составные части: автостоянка личного автотранспорта, лифты), **площадки и проезды** (инв. № 710/С-80804, 510 кв. м), **внутриплощад. сети хозфекал. канализации** (инв. № 710/С-80813, 667,6 кв. м), **сети водоснабжения** (инв. № 710/С-80814, 445,1 кв. м), теплообменник (инв. № 70156), теплообменник ПВВ-07*114*2000 (инв. № 70154), теплосчетчик ТЭРМ-02-6 (инв. № А4006), регулятор температуры (инв. № 70157), электрич. сети и учет (инв. № 70180)

Обременения: площади здания частично сданы в аренду. Здание инженерного корпуса находится в залоге у ОАО «Белагропромбанк». Более подробную информацию можно узнать у организатора аукциона

Начальная цена лота № 3 с НДС 20 % – 1 142 308,94 бел. руб.
(снижена на 50 %)

Лот № 4
Адрес: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Шинная, д. 13

Здание столовой с конференц-залом (инв. № 710/С-5685, 1934 кв. м), **площадки и проезды** (инв. № 710/С-80806, 466 кв. м, составные части: площадки, дорожки, клумба, ограждение), холод. агрегат АРТХ-5 (инв. № 44047), КТП-28 (инв. № 09224)

Обременения: здание столовой и конференц-зала находятся в залоге у ОАО «Белагропромбанк». Более подробную информацию можно узнать у организатора аукциона

Начальная цена лота № 4 с НДС 20 % – 451 080,00 бел. руб.
(снижена на 50 %)

Сведения о земельном участке по лотам № 3 и № 4: пл. **1,0839 га,** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания зданий и сооружений производ. назначения. Ограничения (обременения) прав: после продажи земельный участок будет разделен в долях с установлением сервитута

Лот № 5
Адрес: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Шинная, д. 13

Производственная база в составе: **производственный корпус ГСПКТБ № 1** (инв. № 710/С-13026, 2980,4 кв. м), **здание склада нефтепродуктов** (инв. № 710/С-13003, 86 кв. м, составные части: пристройка), **здание автомобильных весов** (инв. № 710/С-13004, 29 кв. м), **площадки и проезды** (инв. № 710/С-74589, 6580 кв. м, составные части: площадки бетонные, дорожка, асфальтобет. площадка и проезд), **ограждение территории** (инв. № 710/С-80801, 350,45 м, составные части: ограждения наружное метал. корпуса, внутрен. территории, площадки для мусора (деревян.), ограждение (контейнер с отходами), **система пожаротушения** (инв. № 00826).
Сведения о земельном участке: пл. **1,4348 га** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания зданий и сооружений производственного назначения. Ограничения (обременения) прав: сервитут. **После продажи необходимо заключить дополнительно соглашение об установлении сервитута к защитному сооружению гражданской обороны**

Обременения: на территории лота № 1 расположено защитное сооружение гражданской обороны, которое не входит в состав лота. Здание производственного корпуса ГСПКТБ № 1 находится в залоге у ОАО «Беларусбанк»

Начальная цена лота № 5 с НДС 20 % – 925 502,04 бел. руб.
(снижена на 50 %)

Задаток по лотам №№ 1, 2, 4 – 10 %, по лотам №№ 3, 5 – 5 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BYN BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 30 (тридцать) рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета электронных торгов

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнуто договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати)** календарных дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов, установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору торгов в размерах, указанных в информации об аукционе на сайте www.ipmtorgi.by, в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Извещение о проведении предыдущих электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» 21.06.2023

Дата и время начала и окончания электронных торгов:
25.07.2023 с 11.00 до 12.00.
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов.
Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 24.07.2023 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги», по адресу: www.ipmtorgi.by

Контактные телефоны: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06.
E-mail: auction@cpo.by

Информация об аудиторском заключении по бухгалтерской отчетности

ОДО «ТУТ и ТАМ Логистикс»

Дата аудиторского заключения: 31.03.2023 г.

Данные об организации, проводившей аудиторскую проверку: ООО «Гранд-Бизнес Эксперт», зарегистрировано решением Минского горисполкома от 29 ноября 2022 года в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за номером 100024856; местонахождение: 220020, г. Минск, пр. Победителей, 103, административное помещение 507.

Период, за который проводился аудит: с 01.01.2022 г. по 31.12.2022 г.

Аудиторское мнение о достоверности бухгалтерской отчетности: годовая бухгалтерская отчетность достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ОДО «ТУТ и ТАМ Логистикс» по состоянию на 31 декабря 2022 года, а также финансовые результаты его деятельности и изменение его финансового положения, в том числе движение денежных средств за 2022 год в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

Генеральный директор Р. А. Резанов

Главный бухгалтер О. В. Костылева

УНП 100599687

ЗАГАДКАВАЯ ПУШЧА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Пушча — асаблівы свет. Вядома, вандроўніку трэба наведаць музеі, пазнаёміцца з гісторыяй лесу і запаведніка, пакаштаваць пушчанскія стравы. Але важней, на мой погляд, праехацца на веласіпедзе, прайсці пешкі па турыстычных маршрутах, каб убачыць жывы лес. Ну вось, скажам, на экалагічнай сцяжыне пад назвай «Азёрны пярсцёнак» ёсць тры штучныя возеры. Яны створаны ў пачатку 1970-х гадоў для рэгулявання гідралагічнага рэжыму. Вада ў іх цёмная, бо на дне ёсць залежы торфу. І ў гэтай цёмнай вадзе па-асабліваму адлюстроўваюцца дрэвы, сонца, неба — нібы не натуральнае відовішча, а выява на нейкім экране, да таго ж цішыня і запаволенасць наогул ствараюць эфект анімацыі, казкі... Але ў сапраўдную казку трапляеш не тут, а ў запаведнай дубраве, дзе пад полагам дуба і граба стаіць вечны цень. Расліны, што прызвычаіліся да гэтага паўзмроку, уяўляюць сабой асаблівае зялёнае пакрывала з цемнаватым адценнем, што стварае ўражанне, нібы трапляеш у глыбокую старажытнасць, здаецца, вось так было, можа, тысячу гадоў таму. А можа, і сапраўды так было? І цішыня, заспакоенасць, якія бываюць толькі ў пушчы: ніякі іншы лес гэтага не мае ў такім выглядзе. Калі не верыце, варта праверыць.

Цяперашнія турысты ў Камянюкі дабіраюцца ў асноўным сваім транспартам. Хоць гэта нескладана зрабіць і грамадскім. З аўтавакзала ў Брэсце рэгулярна ходзяць аўтобусы, маршруткі. Ад рысы горада да згаданай стаянкі каля 60 кіламетраў. Купіў білет, і праз гадзіну — у пушчы. На стэндзе перад уваходам можна прачытаць усю інфармацыю пра паслугі і экскурсіі. Азнаёміцца можна і загадзя скарыстаўшыся ўласным смартфонам. Цяперашняга турыста, які зацікаўлены ўбачыць векавы лес на свае вочы, прытым не спяшаючыся, думаю, прыцягне магчымасць веласіпеднай экскурсіі.

— Адкрыць для сябе пушчу можна па чатырох асноўных веламаршрутах, — расказала **начальнік аддзела турызму, маркетынгу і рэкламы Нацыянальнага парку «Белавежская пушча» Аксана БАГАЛЕЙША.** — Самае малое падарожжа даўжынёй у 10 кіламетраў называецца «Царская паляна», «Звярыны пераход» — маршрут для сапраўдных аматараў прыроды, «Вялікае падарожжа» расцягнецца на 27 кіламетраў, на шляху сустрэнецца шмат цікавостак.

Сёлетняй вясной веласіпедныя маршруты абазначылі колерамі — белым, чырвоным, зялёным і жоўтым. Гэта для зручнасці турыстаў, каб не марнаваць час, не зазіраць у карту падчас паездкі. Веласіпед можна ўзяць напракат, а можна прыехаць і са сваім.

Хто трапляе ў пушчу ўпершыню, часцей выбірае «Царскую паляну». Відаць, назва прывабліве. Як правіла потым не шкадуюць. Мае знаёмыя, напрыклад, з захапленнем расказвалі пра бярозу з «галавой зубра». Нарост на дрэве, што нечым сапраўды нагадвае галаву гаспадара пушчы, заўважылі больш за 20 гадоў таму. Такі нарост утвараецца, паводле слоў спецыялістаў, калі ў ствол укараняецца іншародны арганізм. Часцей за ўсё гэтымі няпрошанымі гасцямі з'яўляюцца рознага віду грыбы. Дрэва перахварэла і прызвычаілася, а іншародны арганізм утварыў экзатычны горб. Таксама на шляху гэтай экскурсіі сустракаецца аграмадны раскошны дуб-пустэльнік. Гэтаму дрэву трыста гадоў, для дуба не такі вялікі ўзрост, але дыяметр ствала ўжо перавысіў паўтара метра. Мне гэты дуб заўсёды нагадвае разважанні Андрэя Балконскага ў «Вайне і міры» пра ўрачыстасць жыцця.

Балота «Татарская багна» ўжо высахла, а назва засталася, бо ў XIII стагоддзі тут стаялі татары, якія дабраліся аж сюды падчас нашэсця. Былая вузкакалейная дарога, узведзеная немцамі падчас Першай сусветнай, — цяпер вельмі маляўнічае месца. Акупанты тады ўзвялі дарогу, каб вывозіць лес з пушчы. Усяго за паўтара года рукамі палонных паклалі сетку чыгункі працягласцю 325 кіламетраў. Цяпер на месцы асобных вузкакалеек пракладзены асфальт, па ім якраз і праходзяць веламаршруты. Ну і сама паляна цяпер — экзотыка і славутасць. Яна размешчана пасярод гушчару. Паводле некаторых звестак, упершыню тут зладзіў паляўнічы баль кароль Станіслаў Аўгуст Панятоўскі. І з яго лёгкай рукі на паляне сталі гуляць цары, потым генеральныя сакратары. Ну і сучаснікі не адстаюць, сёння тут праводзяцца святы, масавыя мерапрыемствы. А яшчэ па маршруце варта спыніцца ва ўрочышчы «Турлюй», паглядзець маляўнічую лясную развілку, стагадовы сасновы лес ды шмат чаго іншага. І галоўнае, што атрымліваць асалоду можна няспешна, робячы прыпынкі па ўласным жаданні і меркаваннях.

Нездарма ж Белавежскую пушчу наведваюць штогод каля 40 тысяч велатурыстаў. Цяпер Нацыянальны парк вядзе рэканструкцыю многіх сваіх аб'ектаў. Змены адбываюцца ў дэманстрацыйных вальерах. Для дробных звяроў і птушак зрабілі прасторныя клеткі, насельнікаў можна разгледзець бліжэй. Будоўля зачэпіць і ўязную групу ў нацпарк. Як кажуць у пушчы, усё — для зручнасці турыстаў.

Падарожнікі звычайна глядзяць музеі, у тым ліку і новы археалагічны пад адкрытым небам. Можна наведаць заказнік «Выганашчанскі» ў Івацэвіцкім раёне, які таксама ўваходзіць у Нацыянальны парк. Аматарам новых уражанняў карысна будзе адкрыць для сябе і Ружанскую пушчу — не такі раскручаны рэкламай і асвоены турыстамі, але надзвычай цікавы і загадкавы лясны масіў. У любым выпадку варта хоць зрэдку выбірацца ў запаведныя мясціны, шчодра раскіданыя па нашай зямлі.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
Фота Валерыя КАРАЛЯ.

Выпрабавана на сабе

У будні — студэнтка, на выхадныя — паненка

Як сучаснікі ў мінулае падарожнічаюць

Пяць гадоў таму я і не ўяўляла, што такое рэканструкцыя. Толькі некалькі разоў бачыла «рыцарскія турніры» і аднойчы, падчас падарожжа ў Харватыі, трапіла на «гладыятарскія баі». Ды мае сябры прапанавалі наведаць з імі баль. Нават параілі, у каго ўзяць сукенку для першага выхаду, і дапамаглі вывучыць танцы. З гэтага і пачалося стварэнне майго другога, паралельнага жыцця ў іншым стагоддзі. Дзіўным чынам я нібыта ўвесь час рыхтавалася да яго.

Для наведвання гістарычнага балю-рэканструкцыі неабходна прытрымлівацца дрэс-коду суадносна з абраным перыядам, а таксама пажадана ведаць танцы. Вывучыць іх мне было зусім не складана, бо рознымі відамі танца я сур'ёзна займалася гадоў з сямі. Аднак нават тыя, хто ніколі не танчыў, могуць без вялікіх цяжкасцяў падрыхтавацца да балю, бо гістарычныя танцы ў асноўным простыя і пабудаваны на ўзаемадзеянні, галоўнае — не баяцца. І гэта пацвярджаецца назіраннямі: на балях можна сустрэць нямала людзей ва ўзросце. Я, напрыклад, моцна здзівілася, калі даведалася, што аднаму з кавалераў, які без перапынку запрашаў дзяўчат на танец, ужо 72 гады. А пасля высветлілася, што ён яшчэ і добры вершнік, удзельнік клуба ваеннай рэканструкцыі па кавалерыі! Ёсць сярод удзельнікаў і моладзь, некаторыя прыходзяць ужо ў 14—15 гадоў з вялікім жаданнем дакрануцца да гісторыі. Гэта хобі становіцца для большасці ўдзельнікаў важнай часткай жыцця, яны знаходзяць сяброў, а часам — і сапраўднае каханне, будуюць сем'і. Некаторыя аматары наведваюць мерапрыемствы нават з немаўлятамі.

Мерапрыемствы разнастайныя. Некаторыя буйныя, праводзяцца штогод у пэўным месцы і ў пэўны час, прымеркаваны да гістарычных падзей, напрыклад, бітва на Бярэзіне, Бабруйскі кацёл. Ёсць фестывалі, якія паказваюць адразу некалькі перыядаў, напрыклад, «Легендарныя эпохі» ў Зэльве. На іх збіраюцца гледачы. Людзі, не звязаныя з рэканструкцыяй, таксама могуць дакрануцца да яе на так званых грамадскіх балях, дзе нямала вельмі строгага дрэс-коду і патрабаванняў. Але ёсць падзеі і закрытыя, з меншай колькасцю ўдзельнікаў і без гледачоў, затое з большым паглыбленнем у гісторыю: там нельга выкарыстоўваць гаджэты і сучасныя прадметы, трэба прытрымлівацца этыкету і гэтак далей.

Для першых выхадаў можна ўзяць сукенку альбо касцюм напракат. Аднак калі гэта хобі зацягвае, пачынаеш збіраць сваю асабістую вопратку. Рэканструктары заказваюць адзенне і аксесуары ў майстроў, што пры належнай якасці каштуе немалых грошай, альбо шыюць самастойна па гістарычных узорах, як цяпер раблю і я. Мужчынам дазваляецца хадзіць амаль на ўсе мерапрыемствы ў адным і тым жа, асабліва для ваенных, якія абавязаны апранаць форму па ўставе. У дзяўчат і жанчын, як і ў тыя страдаўныя часы, гэта лічыцца дрэнным тонам: прынята хаця б на вялікія балі рыхтаваць новыя сукенкі.

Амаль два гады таму я трапіла яшчэ і ў клуб ваеннай рэканструкцыі па пачатку XIX ст. у якасці маркітанткі (жанчыны пры еўрапейскіх арміях, якія мелі ліцэнзіі на гандаль, гатавалі ежу, мылі і падшывалі вопратку і г. д.). Тут высветлілася, што і мая любоў да прыроды і паходаў, якую з малога дзяцінства прывіваў мне бацька, і тры гады сур'ёзных заняткаў фехтаваннем, і ўменне ездзіць верхам, засвоенае калісьці на падворку ў сяброўкі, да якой я раз-пораз ездзіла ў госці на канікулах у шостым і сёмым класе, прыйшліся вельмі дарэчы. Рэканструкцыя ваеннага фарміравання пачатку XIX стагоддзя прыўносіць у жыццё кожны год не менш як 4-5 выездаў удалячынь ад цывілізацыі, у поле альбо лес амаль без сучасных рэчаў, затое з кампаніяй сяброў-аднадумцаў, з імкненнем прачуць жыццё, апынуцца ў стане салдата таго часу. Тут часцей за ўсё не падабаецца дзяўчатам, якія баяцца мурашак і ніколі не гатавалі на адкрытым вогнішчы, не спалі ў палатцы. Але з бацькам, які прайшоў безліч складаных турыстычных маршрутаў па недасяжных горных рэках Азіі і вазіў з сабою, куды было можна, сваю дачушку, у мяне не было ніякага шанцу не прыстасавацца і не палюбіць такое вольнае жыццё на прыродзе.

У межах ваеннай рэканструкцыі не прынята браць жанчын на ролю салдат, аднак і такое здараецца. Напрыклад, Інга Пяганава, якая ў рэканструкцыі з 2017 года і займаецца адразу трыма перыядамі: XIV ст., XIX ст. і Першай сусветнай вайной. Дзяўчына распавядае:

— Мне больш за ўсё падабаецца ўдзельнічаць у рэканструкцыі Першай сусветнай вайны, апошняй «элегантнай» і першай з выкарыстаннем такой колькасці тэхнікі. Аднак пра яе сёння, на жаль, мала хто згадвае. Там я з'яўляюся грэнадзёрам 4-га Нясвіжскага палка генерала-фельдмаршала князя Барклая-дэ-Толі. Таксама дзяўчаты нашага палка рэканструююць Жаночы ўдарны батальён Марыі Бачкаровай і медсясцёр Чырвонага Крыжа.

Наша мэта — ушанаваць памяць тых, хто абараняў нашы землі, і паказаць, як вайна губіць жыцці і як моцна нам трэба шанаваць гэты крохкі свет.

Па кожным больш-менш глыбока раскрытым гістарычным перыядзе, ад антычнасці і да XX стагоддзя, стварыліся шырокія суполькі, дзе ў кожнага ёсць свой пэўны статус, ёсць «сябры» і «ворагі». Часам здараюцца такія канфлікты, якія прыводзяць да роспуску і раздзялення клубаў, зрываюць мерапрыемствы і ледзь не выліваюцца ў сапраўдную дуэль (хаця і дуэлі ў межах руху здараліся некалькі разоў). У ваеннай рэканструкцыі існуе строгая іерархія, і званні даюцца за кіраванне клубам, арганізацыю добрых мерапрыемстваў, узнагароды — таксама за пэўныя дасягненні. А ў свецкай усё яшчэ больш тонка (мабыць, таму, што кіруюць тут жанчыны?..) Фарміруюцца групоўкі, якія сапернічаюць паміж сабой, а скандалы і інтрыгі здараюцца такія, што сапраўды адчуваеш сябе ў грамадстве дзвесце гадоў таму.

Аднойчы адзін выкладчык сказаў мне, што, здаецца, мне лепей было б жыць за дзвесце гадоў да свайго нараджэння. Мабыць, яно і так, але, падумаўшы пра гэта сур'ёзна, я скажу: не. Мне падабаецца маё сучаснае жыццё на два сусветы.

Ганна РОВІНА.

КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ

Ніна Рыбік — пісьменніца, журналіст з больш як 40-гадовым стажам, доўгі час працавала галоўным рэдактарам газеты «Астравецкая праўда». Пераможца некалькіх рэспубліканскіх і міжнародных журналісцкіх і літаратурных конкурсаў. Аўтар кніг прозы «Сваё і чужыя», «Права на адсяленне», «Скрыжаванні». Ніна Рыбік паходзіць з адселенай вёскі Уласы, што на Хойнікшчыне. Першыя апавяданні пісьменніцы прысвечаны лёсам землякоў, для якіх чарнобыльская катастрофа — пажыццёвы нязгасны боль.

Многія з твораў Ніны Рыбік насычаны драматызмам, прымушаюць задумацца аб праблемах сацыяльных, экзістэнцыяльных. Не выключэнне і апавяданне, якое прапаноўваецца чытачам «Звязды». Аўтар расказвае нам жыццёвыя гісторыі родных сяцёр, Сафеі і Раісы. Да абедзвюх лёс не быў літасцівы, але выпрабаванне вытрымала толькі адна з жанчын. Чаму так? Чытайце Ніну Рыбік...

Алена БРАВА

Ніна РЫБІК

ВЯСЕЛЬНЫ РУЧНІК

***

Вярнуўшыся з фермы, Сафея замяшала і выліла свінням, зачыніла курэй, прычкала з пашы Малышку, падаіла, працадзіла малако. Памыла рукі, змяніла цёмны паўсядзённы фартух на белы і дастала са скрыні палатняны скрутак. Разлажыла на канапе незакончаную вышыўку — пакуль сонца сядзе, можна дашыць хоць бы адзін край. Трэба спяшацца: да Аленінай Марыйкі заслалі сватоў, і Сафею папрасілі вышыць вясельны ручнік.

Усе ў вёсцы стараліся заказаць яго ў Сафеі. Казалі: калі яе ручніком звязаць рукі маладых, то ніякія бяда-гора іх не разлучаць. Шапталіся, што нешта яна ведае, падлічвалі, колькі на якім ручніку кветачак і птушачак, прыглядваліся, у які бок яны глядзяць, і дзівіліся, што ўзор ніколі не паўтараўся.

Вядома ж, ніякага чараўніцтва ў яе ручніках не было. Калі б што ведала, то і сама была б шчаслівай — на сваё вяселле таксама вышыла ручнік, найпрыгажэйшы з усіх, што былі і да таго, і пасля.

Зрэшты, што ж Богу грашыць: была яна шчаслівай...

Ох, як глядзеў на яе Васіль, калі яны сенавалі! І сёння ў вачах яго твар: кропелькі поту блішчаць на шырокім ілбе, вочы іскрацца смехам... Яна ўварочваецца ад непамерных ношак сена, якія муж, не ведаючы стомы, закідвае на верх стога, паддражніваючы:

— Ну-ну, жвавей, маладзічка!

— Закідаў ужо, чорт двужыльны! — яна спрытна перахоплівала чарговы абярэмак. — Дай перадых!

— Вось стог завершым — і адпачнём! Ох, як мы соладка адпачнём з табой, мая галубка, — падміргваў Васіль.

...Так, яна была шчаслівай. Паўгода. Пакуль не пачалася вайна... Васіля забралі ў першы ж дзень. Моцна пацалаваў яе на развітанне — і ўсё... Больш ніводнай вестачкі. Пахаванкі, і той не. «Мо і цяпер стагуе з кім-небудзь», — думала Сафея, дастаючы час ад часу са скрыні свой вясельны ручнік.

І Раісе вышывала яна ручнік.

— Ох, Сафейка, каб ты ведала, які ён, — тулілася сястра, калі прыязджала з тэхнікума на пабыўку. — Такі прыгожы, такі дужы...

Сафею палохала закаханасць малодшай сястры — баялася, каб не насмяяўся з яе хлопец. Але неўзабаве Райка прывезла яго ў вёску — і Сафея ўздыхнула з палёгкай. Хлопец і сапраўды выдатны: прыгожы, пры гальштуку. «Мо і пашчасціць Раечцы», — марыла Сафейка, вышываючы ручнік.

З радні ў Раісы засталася толькі яна, Сафея. Бацьку іх раскулачылі яшчэ ў 30-я за тое, што адмовіўся ўступаць у калгас. Іх выгналі з хаты. Маці была цяжарная Раісай. Прытуліліся перш у далёкіх родзічаў. А як Аксіння разрадзілася, тыя папрасілі: шукайце іншага прыстанішча. Бо і на нас старшыня сельсавета воўкам паглядвае ...

Аксіння выкапала за вёскай на ўзгорку зямлянку, дзёрну зверху нацягала, пячурку, як змагла, зляпіла. Туды і перабраліся.

Маці зранку ішла шукаць работу. У калгас яе не бралі — не заслужыла. Наймалася каму жаць, каму бульбу капаць, каму снапы малаціць... Плацілі што чым: хто кош бульбы дасць, хто — торбачку жыта. А каторы раз прыходзіла з пустымі рукамі. Гаспадарка трымалася на Сафейцы. Яна глядзела малую Райку, цягала з лесу ламачча, варыла што-кольвечы на касцярку ці ў пячурцы...

І вышывала! Маці навучыла яшчэ малую, і маладзіцы неслі ёй вышываць фартухі — у спраўнай гаспадыні іх павінна быць некалькі, спадніца магла быць адна, а фартух — на кожны выпадак. А там і ручнікі, настольнікі да дзеўчаняці панеслі, асабліва ў каго сватоў чакалі, а пасагу бракавала. Плацілі, як і маці, — чым давядзецца. Яна ўсяму была радая.

Праз пяць гадоў, перад вайной, вярнуўся бацька — адбыў свой тэрмін. Прыйшоў схуднелы, бяззубы... Але з такім жа строгім непахісным поглядам, які мякчэў, толькі калі глядзеў на дачок. Сафейка да таго часу расцвіла, занявесцілася, а малая Райка была пузатай, крываногай — казалі, што трэба на сонцы больш бываць і добра харчавацца. Не казалі толькі, дзе браць тыя харчы...

Іх дыхтоўную хату, складзеную бацькам за год да высылкі пад «чысты вугал», ім не аддалі: у ёй было калгаснае праўленне. Пусцілі пажыць у лядашчую хаўчнку дзеда Сымона, што апусцела пасля смерці гаспадара. Сафейцы яна здалася палацам! Бацька падлатаў дзіравы дах, падпёр гатовую разваліцца сцяну, пераклаў печ — перазімавалі.

А ўвосень да яе заслалі сватоў... Васіль неяк убачыў Сафейку на жніве — і з таго часу зачасціў да іх у вёску. На вячоркі дзяўчына не хадзіла — не было ў чым, то ён прыходзіў пад грушку, што расла за хатай, і цярпліва стаяў у чаканні. Калі-нікалі бацька, глянуўшы ў акно, кідаў: «Ну выйдзі ўжо, усю траву вытаптаў гэты твой ухажор» — і яна выскоквала, каб колькі хвілін пастаяць побач, прагнучы і баючыся дотыку рук. А каторы раз бацька бурчэў: «Што яму тут трэба? Хай роўню сабе шукае...» — і Сафея сядзела, унурыўшыся, на печы і вышывала фартух ці ручнік.

Пазней яна даведалася, што і Васіля бацькі не пускалі да яе, і тыя ж словы казалі: не роўня. Ды ён нікога не паслухаў: заслаў сватоў да яе, беспасажніцы. Кахаў...

Толькі і было шчасця ў Сафейкі, што тыя паўгода, пакуль яны былі разам. А потым вайна... Бацьку, Васіля, усіх мужчын забралі. Вёску іх спалілі. Калі пачалася страляніна, Сафея ўхапіла самае каштоўнае — Біблію, укруціла яе ў свой вясельны ручнік ды кінулася да лесу.

Яны хаваліся ў зарасніках з мая і аж да восені, пакуль не прыйшло вызваленне. Вярнуліся на папялішчы, і зноў — зямлянка, холад, голад, вошы... Маці памерла ад тыфу, прыйшла пахаванка на бацьку. Малая Райка засталася на руках сястры.

Але неяк жа выкараскаліся. І хаўчнку яна неяк стуліла: саломай крытую, з земляной падлогай, адзіным малюсенькім акенцам... Пазней, як пайшла на ферму, трохі лепшую агорала. Працавала, сябе не шкадуючы.

А вечарамі вышывала. Любіла гэтую справу. Асабліва калі ручнікі заказвалі. Тады сваё кароткае шчасце згадвалася... Вось і сёння, уяўляючы, якім будзе вяселле ў Марыйкі, яна вышывала дробнымі блакітнымі крыжыкамі галубкоў, што ішлі з кветачкамі ў дзюбках насустрач адзін аднаму...

Фота Анатоля ЮЦЕШУКА.

Раптам у сенцах нешта шкрабнула.

— Хто там? — адклала вышыўку Сафейка.

Дзверы прыадчыніліся.

— Гэта я, цётачка... Можна, я ў цябе сёння паначую?

— А божачкі, Галечка!

І спытала тое, што і так было зразумела:

— А мамка што? Зноў?..

Дзяўчынка моўчкі кіўнула русявай галавой і заплакала.

— Ну, супакойся, — прытуліла малую Сафейка. — Зараз павячэраем. Ты ж, мусіць, галодная?

— Рабі ўрокі і кладзіся спаць, — наказала Галечцы, калі яны пад'елі хлеба з малаком і Сафея разаслала пасцель.

— А ты куды? — ускінулася малая.

— Да вас схаджу, пагляжу, што мамка твая робіць...

— Ды што яна робіць? Ляжыць п'яная... Крычыць... Кажа, што гэта з-за мяне татка нас пакінуў, бо яна пасля родаў стала тоўстай. І з-за цябе — што ты вечна сноўдалася да нас, фермай смярдзела... Але ж гэта няпраўда!

— Ты не крыўдуй на яе...— пагладзіла дзяўчынку па галаве Сафейка. — Гэта не мамка твая гаворыць. Гэта гарэлка ў ёй крычыць. І крыўда на бацьку... Ты кладзіся спаць...

... Малодшая сястра, якую Сафея гадавала пасля вайны, была яе шчасцем і болем. З брыдкага качаняці Рая вылюднела ў сапраўдную паненку: статная, косы на галаве каронай... Сафейка, любуючыся сястрой, старалася апрануць дзяўчыну як прыгажэй, лепшы кавалак падсунуць. Работай не нагружала: хай вучыцца! Яна сама толькі чатыры класы закончыла, далей было не да таго, хоць і вельмі хацелася. У яе не атрымалася — то мо хоць Раісе пашчасціць вырвацца з іх беспрасветнай нядолі...

Сястра пасля школы паступіла ў сельскагаспадарчы тэхнікум. Там і сустрэла свайго Сашу. Радавалася Сафейка: спраўджваліся яе мары! Вяселле ім справіла. А вясельны ручнік такі вышыла, што вяскоўцы надзівіцца не маглі. Прыгажэйшым быў толькі яе ўласны...

Пасля вучобы прыехалі маладыя ў іх калгас. Рая стала працаваць ветэрынарам, муж — аграномам. А неўзабаве прызначылі яго старшынёй. Злыя языкі мяцелілі, што Тарлецкі наўмысна падвёў свайго папярэдніка. Але Сафея лічыла, што вяскоўцы ад зайздрасці плёткі плятуць.

Гэтак жа не верыла, калі сталі гаварыць, што Тарлецкі займеў каханку ў суседняй вёсцы.

Але ж людское вока не падманеш. І чужы рот не заткнеш... Хутка тыя размовы дайшлі і да Раі. Жонка паехала да саперніцы разбірацца — і ўбачыла, што тая цяжарная. Муж тады сабраў рэчы і паехаў да новай жонкі.

Ад гэтай здрады сястра так і не аправілася. Моцна кахала... Піць стала. Муж прыязджаў у вёску — прычакаўшы яго, скандаліла, пагражала, што пойдзе ў райкам, а то прыніжалася, рукі цалавала, прасіла вярнуцца... Тарлецкі, каб не сустракацца з былой жонкай, перавёўся ў іншы калгас.

Сафейка ўшчувала сястру, прасіла падумаць пра дачку. Галечка плакала. Але Рая нічога і нікога не чула. Што б ні гаварылі — маўчала. А як толькі заставалася адна — напівалася. Сафея старалася абшукаць кожную шчыліну ў хаце, каб нідзе гарэлкай і не пахла, — але ж з Раінай работай заўсёды было дзе ўзяць: там карова расцяліцца не можа, у таго кабанчыка трэба злягчаць...

...Колішні старшынёўскі дом стаяў на ўзгорку. Раіса ляжала на канапе.

— Ну, чаго прыпёрлася? — паспрабавала ўстаць, калі Сафея шчоўкнула выключальнікам. Але не ўтрымалася на нагах. — Зноў мараль чытаць будзеш? Дасталі ўсе! Я нікому не камандую, як жыць, — то чаго вы ўсе да мяне лезеце? Хачу п'ю, хачу — сплю, захачу — мужыкоў любіць буду! У цябе не спытаюся!

Раіса доўга нешта крычала — злое, абразлівае, крыўднае. Сафея не звяртала ўвагі. Моўчкі прыбрала са стала брудныя рэшткі незразумелай яды, выкінула бутэльку, падмяла хату. І толькі калі сястра змоўкла, прысела побач, пагладзіла, як малую, па галаве:

— Раечка... Гаротніца мая...

Раіса расплакалася. Схапіла яе рукі, стала цалаваць. Чым больш плакала, тым цверазейшай станавілася.

Плакала і Сафея.

— Малая ў цябе? — супакоіўшыся, спытала Рая.

— У мяне — дзе ж ёй яшчэ быць...

— Ты глядзі яе, Сафейка... Як мяне глядзела... На цябе надзея...

— У Галечкі маці ёсць. Яе ніхто не заменіць.

— Ты ж мне замяніла...

— Ты не раўняй. У нас маці памерла. А ты жывая...

Раіса адвярнулася да сцяны, плечы ў яе затрэсліся ад бязгучнага плачу. Сафея пашкадавала ўжо, што сказала балючыя словы. «Нічога, можа, пройме... Нешта ж павінна яе праняць!» — думала, пагладжваючы сястру па плячы.

Тая нарэшце павярнулася:

— Адно гора вам ад мяне... Ды толькі... Зразумей, сястрычка: не магу я! Выгарэла ўсё ўсярэдзіне... Нібы выняў ён маё сэрца і з сабой забраў.

— Адпусці, Раечка. Забудзься...

— Не магу... Ужо ж не дзень, нават не год мінуў, а — не магу! Ці ўранні, ці ўдзень, ці вечарам, кожная думка — пра яго. Разумею: не вернецца, трэба выкінуць яго з галавы і з сэрца, — а не магу. Толькі тады і лягчэе, як выпю. Зразумей мяне, Сафейка. Даруй...

— Дараваць не цяжка. А жыць як? Мне дык ладна — а Галечцы? Табе цяжка, а ёй — ці лёгка? Сябе ты шкадуеш, знайшла лякарства, а дзіця тваё хто пашкадуе, душу яго палечыць?

— Ты, — сумна ўсміхнулася Раіса. — Хто ж яшчэ? Ты Галечку не пакінеш. І ручнік вясельны, як пара прыйдзе, вышыеш ...

— А гэты во — забяры, — Раіса дастала з-пад падушкі ручнік — пакамечаны, у плямах, месцамі падпалены і парваны — і сунула ў рукі сястры. — У печ укінь... Мо тады адпусціць...

Сафея глядзела на вышыты кавалак паркалю — і не пазнавала сваю работу.

— Толькі сёння ж спалі, чуеш? — загадала Рая. — Сама не магу. Спрабавала: кіну ў агонь — і назад выхоплюю... Думаю: пакуль ручнік, якім нашы рукі звязалі, цэлы — ён нас трымае... Ды ўжо не хачу, каб трымаў! Спалі!

...Вярнуўшыся дахаты на золку, Сафея перш-наперш кінула ў печ Раісін ручнік. Калі языкі полымя заскакалі па бярозавых паленцах, па галубках і кветачках на ручніку, прыбегла суседка...

Раісу дасталі з пятлі. Суседка знайшла: прыбегла ветэрынаршу паклікаць, калі карова ранкам не паднялася. Яшчэ цёплай была Раіса...

А праз тры дні пераказалі, што памёр ад сардэчнага прыступу Саша.

Больш вясельных ручнікоў Сафейка не вышывала...

ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «БЕЛГРАН»

Лот	Наименование	Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб.	Задаток, бел. руб.	Шаг аукциона, бел. руб.
1	ТЕЛЕВИЗОР LCD LG 19LV2500, инв. № 1652; Монитор Philips, инв. № 1690; жесткий диск 2,5'', инв. № 3262	184,68	18,47	9,23
2	Аппарат для нагрева и охлаждения воды YLR2-5-X, инв. № 1697; водонагреватель EPPV-27, инв. № 1666; водонагреватель электрический Timberk SWH MS2 10 H, инв. № 6346; аппарат для нагрева и охл. воды YLR2-5-X, инв. № 1697	408,24	40,82	20,41
3	Принтер HP Laser Jet Pro MFP M132a RU (G3Q61A) A4, белый, инв. № С-27426; принтер HP LasserJet P1102, инв. № 8888; принтер Kyocera KM-1635, инв. № 650; принтер Canon i-sensys, инв. № 679; принтер Canon LBP2900, инв. № 601; принтер Canon i-sensys, инв № 600; принтер LaserJet P1005, инв. № 1829; МФУ Canon MG 2440; принтер МФУ HP LaserJet M1132, инв. № 687; МФУ Canon i-sensys MF4750 с картриджем, инв. № 5270; принтер Canon i-sensys LBP3010B, инв. № 677; ПРИНТЕР ЛАЗЕРНЫЙ HP Laserjet 1010, инв. № 1827	2709,72	270,97	135,49
4	Стул 1120BL Z11, инв. № 327; стул SAMBA S SP-A, инв. № 279; стул 1120 BL Z11, инв. № 327, 6 шт.	353,16	35,32	17,66
5	Зеркало, инв. № 413; зеркало, инв. № 413	23,76	2,38	1,19
